Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК І МІНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 14 (6593) | 17 студзеня 1940 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

Всесоюзная библиотека имени В. И. Ленина

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Аб узнагароджанні вайсковых часцей Чырвонай Арміі, начальствуючага састава і чырвонаармейцаў.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб узнагароджанні ордэнам «Красное знамя» 19-га стралковага палка.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР аб прысваенні звання Героя Совецкага Саюза чырвонаармейцам і начальствуючаму саставу Чырвонай Арміі.

У Соўнаркоме Саюза ССР і ЦК ВКП(б). Аперзводка Штаба Ленінградскай Ваеннай Акругі.

Пленум Мінскага ГК КП(б)Б.

У дапамогу прапагандыстам.

І. М. Ільюшын — Развіццё Леніным марксісцкай тэорыі пазнання.

Пладовыя насаджэнні — на сядзібы калгаснікаў.

АРТЫКУЛЫ:

І. Шаціла — Севазабарот і барацьба за 100 пудоў зернавых.

К. Аляксееў — Тэкстыльная прамысловасць БССР у 1940 годзе.

П. Пінскі — Змяняецца жыццё.

З. Багатаў — Навесці большэвіцкі парадак у кааперацыі Палескай вобласці.

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН. **С. Куняўскі** — Афяры і прыбытак.

ЗА РУБЯЖОМ:

Рух у Англіі за мір. Адказ англійскага ўрада на ноту амерыканскіх краін. Водгукі англійскага друку на прамову Саймона. Ваенныя мерапрыемствы бельгійскага ўрада. Японскі імператар адобрыў састаў новага кабінета.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі.

ЗАДАЧЫ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР У 1940 ГОДЗЕ

У гэтыя дні СНК БССР зацвердзіў выніковыя планы для ўсіх галін рэспубліканскай і мясцовай прамысловасці на 1940 год.

План ва ўмовах социялістычнай гаспадаркі мае вялікае мабілізуючае і арганізуючае значэнне. Ён канцэнтруе ўвагу, сілы і энергію ўсіх рабочых і служачых, гаспадарчых і інжынерна-тэхнічных работнікоў, партыйных і профсаюзных арганізацый на вырашэнне чарговых задач социялістычнага будаўніцтва. А задачы, якія стаяць перад нашай прамысловасцю, вялізныя і складаныя.

Апублікаванае ўчора паведамленне аб выкананні плана СССР аб выніках 1939 гаспадарчага года яркa паказвае, якіх вялікіх поспехаў дабілася наша прамысловасць у мінулым годзе. Рост выпуску ўсёй прадукцыі складае 14,7 проц. У 1940 год з'яўляецца рашаючым годам чацвёртай сталінскай пяцігодкі. Наша социялістычная прамысловасць аснашчана новай тэхнікай. Партыя вырасціла сваю плеяду таленавітых гаспадарнікаў, новую тэхнічную інтэлігенцыю. Стаханаўскі рух разгортваецца ўшыр і ўглыб. Усё гэта заключаецца ў тым, каб, апіраючыся на дасягненні мінулых год, зрабіць кожны гаспадарчы год годам найбольшага росквіту прадукцыйнасці працы.

Згодна планам прадугледжан рост валавой прадукцыі па рэспубліканскай і мясцовай прамысловасці ў нязменных цэнах 1926/27 гг. на 80 млн. руб. Усяго павінна быць выпушчана прадукцыі (без раённых абласцей) на 1.074,5 мільёна рублёў, амаль на 7 проц. больш, чым у мінулым годзе. Прамысловай кааперацыі прадпісана выпусціць прадукцыі ў нязменных цэнах 1932 г. на 1.116,5 млн. руб. — рост на 14,5 проц. Па асобных наркаматах і галінах прамысловасці прадугледжан яшчэ большы рост валавой прадукцыі: па выраб будматэрыялаў—20,7 проц., Наркамтэкстылю — 16,3 проц. Наркаммясцпрому—12,4 проц., шкляной прамысловасці — 15,7 проц. і т. д.

Прамысловасць павінна зрабіць у гэтым годзе яшчэ адзін вялікі крок наперад у галіне выпрашэння асноўнай эканамічнай задачы, пастаўленай XVIII з'ездам ВКП(б). Эканаўцы, уларнікі, усе рабочыя прамысловасці, сумесна з гаспадарнікамі і інжынерна-тэхнічнымі работнікамі, змагаюцца за тое, каб выпусціць для патрэб народнай гаспадаркі больш машын, зэканомiць паліва, загатовіць больш лесу, а таксама насельніцтва выпусціць больш прамысловага спажывання: абутку, швейных вырабаў, мэблі, трыкатажа, розных тавараў, нашы абутковыя фабрыкі павінны выпусціць 6.850 тыс. пар абутку, на 520 тыс. пар больш, чым у мінулым годзе. Швейныя фабрыкі адных толькі касцюмаў павінны выпусціць 1 млн. 139 тыс., брук — 1 млн. 500 тыс., бялізнавых вырабаў — 1 млн. 204 тыс. — рост на 1 млн. 70 тыс. адзінак. Прамысловасць Наркамтэкстыльпрома выпусціць ільняных тканін на 10 тыс. метраў больш, чым у мінулым годзе. У 2—2,5 раза павялічыць выпуск шарсцяных тканін прамысловая кааперацыя, і г. д.

Большэвіцкае выкананне вялізных задач, якія стаяць перад нашай прамысловасцю, патрабуе ўздыму вытворчай культуры на новую, вышэйшую ступень. Лепш арганізаваць вытворчасць, шырока ўнядрыць перадавыя стаханаўскія метады работы — арганізаночнае абслугоўванне, сумяшчэнне прафесій і аперацый,—рашуча змагацца за ўдасканаленне тэхналагічных працэсаў, за ўнядрэнне малай механізацыі, за эканомнае расходаванне сыравіны і матэрыялаў, за перадавыя штатныя нарматывы; з меншай колькасцю рабочых і служачых, абслугоўваючага персанала выпускаць максімум прадукцыі — вось тыя шляхі, якія паказвае сабе апіраўдалі і гарантуруюць дасягненне новых перамог у гэтым годзе.

Мясцовая прамысловасць закончыла мінулы год з немалымі поспехамі. Рад трэстаў Наркаммясцпрома і многія прадпрыемствы датэрмінова выканалі свае галавыя праграмы. Аднак, трэба з усёй большэвіцкай рашучасцю сказаць, што пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб палепшанні работы мясцовай прамысловасці выконваецца куль што нездавальняюча. Па-ранейшаму мала ўвагі аддаецца абласной і раённай прамысловасці, якая недавыканала план мінулага года на 5,8 проц. Мала клопатаў праяўляў наркамат аб расшырэнні вытворчай базы прамысловасці, выкарыстаннем прадукцыю шырокага спажывання. З 19 прадпрыемстваў, якія згодна рашэння СНК СССР павінны былі быць пабудаваны і асвоены ў мінулым годзе, пабудаваны, і то не поўнасцю, толькі—5. Дзве трэці адпушчаных на гэту мэту сродкаў не скарыстаны. Не выкананы рашэнні аб расшырэнні асартымента прадукцыі шырокага спажывання, аб паляпшэнні абслугоўвання насельніцтва бытавым рамонтам і т. д.

Народны Камісарыят Мясцовай прамысловасці (нарком т. Каган) яшчэ не стаў сапраўдным кіруючым штабам абласной і раённай прамысловасці. Задачы далейшага развіцця мясцовай прамысловасці патрабуюць, каб гэтыя буйнейшыя недахопы ў рабоце наркамата былі як мага хутчэй ліквідаваны.

Неабходна сканцэнтраваць максімум увагі на асваенні тых новых 71 віду вырабаў шырснажыву (мясарубкі, чыгунныя скавародкі, электрапліткі, прымусныя гарэлкі, вёдры, замкі, жараўпорная посуда і т. д.), якія вызначаны наркаматам для выпуску на 1940 г.

Лёгкая прамысловасць рэспублікі стаіць перад новымі вялікімі задачамі. У 1940 годзе неабходна, нарэшце, ліквідаваць адсталасць шкляной прамысловасці. Усе магчымасці для гэтага ёсць.

У лёгкай прамысловасці яшчэ многа немеханізаваных працаёмкіх працэсаў. Таму тут трэба аддаць максімум увагі ўнядрэнню малай механізацыі, шырэй разгарнуць масавы рацыяналізагарскі рух, уважліва адносіцца да кожнай рацыяналізатарскай прапановы рабочых, інжынераў і тэхнікаў.

Важнейшай задачай лёгкай прамысловасці з'яўляецца перанясенне перадавога вопыту лепшых прадпрыемстваў Саюза. Узяць, напрыклад, Белшвейтрэст (дырэктар т. Лахман). Нельга сказаць, каб кіраўнікі трэста сур'ёзна, па-большэвіцку клапаціліся аб перайманні перадавога стаханаўскага вопыту швейных фабрык РСФСР і Украіны. Тэхналогія многіх швейных фабрык БССР несумненна адсталa. Механізаваны канвеер, гэты складаны працэс яшчэ вельмі слаба ўжываюцца на нашых швейных прадпрыемствах. А Белшвейтрэст лічыць за лепшае таптацца на месцы. Не прыняў ён таксама мер да шырокага распаўсюджання стаханаўскага вопыту па сумяшчэнню аперацый. Стаханаўцы швейных фабрык праяўляюць вялікую ініцыятыву па ўнядрэнню перадавой тэхналогіі. Наркамлегпрому трэба падтурхнуць кіраўнікоў Швейтрэста, каб яны па-большэвіцку ўзначальвалі ініцыятыву мас.

Не менш адказныя задачы стаяць у бягучым гаспадарчым годзе перад тэкстыльнай, харчовай, мясамалочнай і асабліва паліўнай прамысловасцю рэспублікі, а таксама прамысловай кааперацыяй. Гэтыя задачы будуць паспяхова вырашаны, калі нашы прамысловыя наркаматы, трэсты, дырэктары прадпрыемстваў, партыйныя і прафесіянальныя арганізацыі будуць пабольшавіцку кіраваць стаханаўскім рухам і социялістычным спаборніцтвам.

XVIII партыйны з'езд патрабаваў ад гаспадарнікаў, партыйных і профсаюзных арганізацый жывога, аператыўнага і дзелавога гаспадарчага кіраўніцтва. Між тым, асобныя кіраўнікі нашых наркаматаў і трэстаў больш займаюцца агульнымі разважаннямі аб новых формах стаханаўскага руху, чым сапраўды кіруюць і дапамагаюць прадпрыемствам у справе іх унядрэння. Вельмі мала яшчэ выпадкаў, каб калегіі наркаматаў і трэсты непасрэдна падхапілі і абмеркавалі каштоўныя пачынанні стаханаўцаў і па сваёй уласнай ініцыятыве прынялі б меры да іх унядрэння ў вытворчасць. А зрабіць гэта—прывейшы абавязак кожнага большэвіка-гаспадарніка!

Яшчэ шырэй разгорнем социялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі! Шырока ўнядрым перадавы стаханаўскі вопыт у вытворчасць! Даб'емся высокай дастойнай социялістычнага грамадства прадукцыйнасці працы! Забяспечым жывое аператыўнае гаспадарчае кіраўніцтва прамысловасцю! Выканаем і перавыканаем вытворчыя планы 1940 года!

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 16 студзеня на **Мурманскім, Ухцінскім** і **Рэбольскім** напрамках бываліся пошукі разведчыкаў. На **Петразаводскім** напрамку прадаўжаліся сутычкі пяхотных часцей.

На **Карэльскім перашэйку** рэдкая артылерыйская стральба. Спроба праціўніка правесці разведку на шырокім фронце нашымі разведчасцямі адбіта. Праціўнік мае вялікія страты.

Наша авіяцыя рабіла разведчыя і месцамі бамбардыравала дзеянні па чыгуначных вузлах і ваенных аб'ектах.

ІНІЦЫЯТЫВА ПЕРАТВАРАЕЦЦА Ў ЖЫЦЦЁ

На ініцыятыве выкладчыкаў Комуністычнага інстытута журналістыкі БССР т. Немца, Б. Лібермана, Ф. Святцова, Зенько было ўзнята пытанне аб стварэнні ў гор. Мінску штучнага возера. Каштавы рабочых, служачых, інтэлігенцыі, арганізацыі комсамола, профсаюзаў шырока абмеркавалі гэтую прапанову і падтрымалі выдатную ініцыятыву.

Днямі бюро гаркома КП(б)Б вынесла пастанову стварыць пры мінскім горвыканкоме штаб грамадскай садзейнасці будаўніцтву возера ў саставе 20 чалавек.

Абавязак штаба — кантраляваць і дамагчыць за тэрмінам выканання праектных работ будаўнічых работ, праводзіць масавую работу на заводах, фабрыках, установах, на былых выбарчых участках, арганізоўваць працоўны ўдзел насельніцтва ў будаўніцтве.

Прапанавана райкомам КП(б)Б да 20 студзеня 1940 г. правесці адкрытыя партыйныя сходы, а таксама сходы рабочых і служачых на ўсіх прадпрыемствах, установах, навучальных установах і промарцелях горада па пытанню будаўніцтва штучнага возера.

На гэтых сходах трэба стварыць пастаянна дзеючыя грамадскай садзейнасці будаўніцтву штучнага возера, якія павінны працаваць у цесным кантакце са штабам.

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ВАЙСКОВЫХ ЧАСЦЕЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ, НАЧАЛЬСТВУЮЧАГА САСТАВА І ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР 27-мі камандзірам і чырвонаармейцам за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і праяўленыя пры гэтым адвагу і гераізм прысвоена званне Героя Совецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медалі «Залатая звязда».

За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і за праяўленыя пры гэтым асабістым саставам доблесць і мужнасць Прэзідыум Вярхоўнага Совета Саюза ССР узнагародзіў 19-ы стралковы полк ордэнам «Красное знамя».

Асобнымі ўказамі за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР узнагародзіў ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза 2.606 чалавек. З іх: ордэнам Леніна—38 чал., ордэнам «Красное знамя»—713 чал., ордэнам «Красная звезда»—377 чал., медаллю «За отвагу»—817 чал., медаллю «За боевые заслуги»—661 чал.

Паіменны спісак усіх узнагароджаных публікуецца ў газетах «Правда», «Известия», і «Красная звезда».

Гэта ўзнагароджанне з'яўляецца новым сведчаннем гарачай любві партыі Леніна—Сталіна і совецкага ўрада да Чырвонай Арміі, высокай ацэнкі імі дзеянняў байцоў, камандзіраў, камісараў і палітработнікаў, якія ў славу сваёй радзімы з доблесцю і адвагай, не шкадуючы сваёй крыві і нават самога жыцця, узорна выконваюць баявыя заданні камандавання.

УКАЗ
ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР
Аб узнагароджанні ордэнам „Красное знамя“ 19-га стралковага палка

За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць узнагародзіць 19-ы стралковы полк ордэнам «Красное знамя».

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 15 студзеня 1940 г.

УКАЗ
ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА САЮЗА ССР
Аб прысваенні звання Героя Совецкага Саюза чырвонаармейцам і начальствуючаму саставу Чырвонай Арміі

За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць Прэзідыум Вярхоўнага Совета Саюза ССР прысвоіў званне **Героя Совецкага Саюза** з уручэннем **ордэна Леніна** і медалі **«Золотая звезда»**:

1. Чырвонаармейцу **Арцюху** Уладзіміру Кузьмічу
2. Малодшаму камандзіру **Бахвалаву** Васілію Петровічу
3. Старшаму лейтэнанту **Бальшанову** Нікіфару Грыгор'евічу
4. Лейтэнанту **Булаўскаму** Віктару Канстанцінавічу
5. Камбрыгу **Вешнзву** Петру Еўгеньевічу
6. Малодшаму камандзіру **Волк** Барысу Васільевічу
7. Чырвонаармейцу **Высоцкаму** Кузьме Дзмітрыевічу
8. Малодшаму камандзіру **Галахаву** Васілію Іванавічу
9. Лейтэнанту **Груздзеву** Васілію Грыгор'евічу
10. Палкоўніку **Кошуба** Уладзіміру Несцеравічу
11. Малодшаму лейтэнанту **Кічыгіну** Нікалаю Грыгор'евічу
12. Чырвонаармейцу **Камарову** Івану Міхайлавічу
13. Ваентэхніку 2 ранга **Коваль** Івану Іванавічу
14. Малодшаму камандзіру **Лапцеву** Грыгорыю Міхайлавічу
15. Малодшаму камандзіру **Ларчэнка** Міхаілу Андрэевічу
16. Малодшаму камандзіру **Лебасцеву** Міхаілу Абрамавічу
17. Малодшаму камандзіру **Лапаціну** Фёдару Іванавічу
18. Малодшаму камандзіру **Лупаву** Еўгенію Алексеевічу
19. Старшаму лейтэнанту **Маргуліс** Давіду Львовічу
20. Чырвонаармейцу **Нікіціну** Нікалаю Нікіцічу
21. Чырвонаармейцу **Пулькіну** Грыгорыю Сцепанавічу
22. Лейтэнанту **Родзічзву** Міхаілу Матвеевічу
23. Чырвонаармейцу **Сімоняну** Карпет Семёнавічу
24. Чырвонаармейцу **Саламонікаву** Івану Міхайлавічу
25. Малодшаму лейтэнанту **Усаву** Паўлу Васільевічу
26. Чырвонаармейцу **Ульянаву** Івану Міхайлавічу
27. Капітану **Угрумаву** Нікалаю Сцепанавічу

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
15 студзеня 1940 г.

НА ПЛЕНУМЕ МІНСКАГА ГАРКОМА ПАРТЫІ

Учора пленум Мінскага гаркома партыі заслухаў даклад загадчыка гарана тав. Чучко аб становішчы работы ў пачатковых, няпоўных сярэдніх і сярэдніх школах горада Мінска.

— Партыя і ўрад, — гаворыць тав. Чучко, — аддаюць вялікую ўвагу совецкай школе, выхаванню падрастаючага маладога пакалення нашай социялістычнай радзімы. У горадзе Мінску на народную асвету кожны год расходуецца 10 мільёнаў рублёў, пабудавана 19 сталінскіх школ. Вырашчаны выдатныя кадры настаўнікаў, якія праяўляюць большэвіцкія клопаты аб комуністычным выхаванні дзяцей.

Дакладчык прыводзіць многа фактаў выдатнай работы многіх школ і настаўнікаў. Аднак гэтыя поспехі маглі-б быць яшчэ большымі, калі-б органы народнай асветы, комсамольскія і профсаюзныя арганізацыі па-сапраўднаму займаліся школай. Адсутнасць неабходнай увагі да школы з боку грамадскіх арганізацый прыводзіць да вялікіх недахопаў у выхаванні дзяцей. Ва многіх школах ёсць вялікая колькасць непаспяваючых вучняў, наглядаюцца парушэнні дысцыпліны, асобныя вучні ўступаюць у спрэчкі з настаўнікам, а часамі займаюцца хуліганствам. Выключна слаба вывучаецца руская і беларуская мова. Па гэтых прадметах асабліва многа нездавальняючых адзнак. За першае паўгоддзе агульная паспяховасць дасягае толькі 70,9 проц.

У сваім дакладзе тав. Чучко адзначыў, што партыйныя арганізацыі горада мала цікавяцца работай школ, не займаюцца сур'ёзна пытаннямі выхавання дзяцей. Ёсць многа выпадкаў, калі дзеці комуністаў недастойна вядуць сябе на занятках, парушаюць дысцыпліну, а бацькі не звяртаюць на гэта ніякай увагі. Вось, напрыклад, у члена партыі т. Маеровіча (партарганізацыя Рыбтрэста) сын хуліганіць, парэзаў паліто вучням. Бацьку гаварылі аб гэтых фактах, прасілі ўздзейнічаць на хлопчыка, але дагэтуль нічога не зроблена. У комуніста т. Манірыка дачка заўсёды спазняецца на заняткі, а бацькі патураюць такім паводзінам. Партыйныя арганізацыі абавязаны не пакідаць без увагі такія факты, абмяркоўваць на партыйных сходах няправільныя адносіны комуністаў да выхавання сваіх дзяцей. Бацькі і школа павінны сумеснымі сіламі выхоўваць дзяцей у комуністычным духу.

Пасля даклада разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Выступаўшыя зусім правільна і заслужана крытыкавалі гарком комсамола, які не займаўся пытаннямі работы школ, выхаваннем дзяцей, наладжваннем работы ў комсамольскіх і піонерскіх арганізацыях школ.

У спрэчках выступілі тт. Ферлэр (сакратар Мінскага гаркома комсамола), Фішбейн (гарком партыі), Седзіна (дырэктар 7-й школы), Позняк (дырэктар Мінскага пединстытута), Гурчанка (загадчык райана Сталінскага раёна) і інш.

Пасля заключнага слова т. Чучко пленум прыняў разгорнутае рашэнне, у якім намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па наладжванню работы ў школах. Пленум абавязаў усе партыйныя арганізацыі на бліжэйшых сходах абмеркаваць пытанні работы школ і комуністычнага выхавання дзяцей.

Пленум абмеркаваў таксама арганізацыйныя пытанні. У сувязі з пераходам т. Вінаградава на другую работу пленум аслабаніў яго ад абавязкаў сакратара гаркома КП(б)Б.

Трэцім сакратаром гаркома КП(б)Б заверджан тав. Власаў.

У сувязі з выездам у іншыя партыйныя арганізацыі тт. Кухта і Раманава, пленум аслабаніў іх ад абавязкаў членаў бюро гаркома партыі. Пленум увёў у састаў бюро гаркома тт. Кажлана і Шульца.

Учора пленум закончыў сваю работу.

У СОЎНАРКОМЕ САЮЗА ССР І ЦК ВКП(б)
Аб планіраванні сартавых пасеваў зернавых культур у калгасах

Соўнарком Саюза ССР і ЦК ВКП(б) адзначылі, што за апошнія два гады ёсць вялікія дасягненні ў справе пашырэння сартавых пасеваў і паляпшэння сартавой якасці насення.

Аднак, існуючы парадак планавання сартавых пасеваў зернавых культур звязвае ініцыятыву калгаснікаў у адносных свабоднага выбару лепшых высокаўраджайных сартоў як селекцыйных, так і мясцовых, а таксама супярэчыць устаноўленаму парадку планавання пасеваў зернавых культур у калгасах.

У мэтах узняцця ініцыятывы і запікаўленасці шырокіх мас калгаснікаў у справе далейшага павелічэння ўраджайнасці, пляхам правільнага выбару высокаўраджайных сартоў і ўзмацнення аднаснасці калгасаў за планаванне пасеваў зернавых культур па сартах, Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) пастанавілі:

1. Адмяніць існуючы парадак планавання пасева сартоў зернавых культур, які прадугледжвае абавязковае давядзенне да калгасаў пасеўных плошчаў па сартах.

2. Прадаставіць права выбару сартоў самім калгасам па свайму ўгледжанню ў прадзелах прынятага сортараянірования для данай зоны (сарты асноўныя і дапушчальныя, як селекцыйныя, так і лепшыя мясцовыя).

3. Абавязаць праўленні калгасаў распрацаваныя імі планы пасеву зернавых культур па сартах ставіць на абмеркаванне і зацвярджэнне агульных сходаў калгасаў.

4. Устанавіць, што прынятыя агульнымі сходамі калгаснікаў планы пасеву зернавых па сартах павінны ў паслядуючым парадку зацвярджацца раённымі выканкомамі. Пры гэтым райвыканкомы могуць уносіць змены ў планы калгасаў толькі ў тых выпадках, калі ў прадстаўлены калгасам план уключаны сарты, якія не адносяцца да данай зоны.

Лічыць абавязковым пры зацвярджэнні райвыканкомамі планаў пасеваў зернавых па сартах у калгасах удзел аграномаў райнасентаса і сортавыпрабавальнага ўчастка, абслугоўваючага калгасы данага раёна.

5. Снабжэнне калгасаў высокаякасным сартавым насеннем для насенных участкаў і надалей праводзіць праз райнасентасы ў адпаведнасці з прад'яўляемымі патрабаваннямі калгасаў і планам сортабнаўлення.

6. Абавязаць сартавое ўпраўленне Наркамзема Саюза ССР, наркаматы земаў рэспублік і край(абл)земадзелы праз сеткі Дзяржсортфонда выдаваць калгасам сартавое насенне для сортаабнаўлення насенных участкаў у адпаведнасці з паданымі калгасамі патрабаваннямі.

7. Пасевы ў калгасах новых перспектыўных сартоў праводзіць са згоды калгасаў, забяспечыўшы шырокі ўзел калгаснікаў у вытворчай ацэнцы сорта і ўзмацніўшы адказнасць селекцыйных станцый і сортавыпрабавальных участкаў на правільную гаспадарчую ацэнку ўводзімых у вытворчасць сартоў.

8. Абавязаць раённыя выканкомы зацвярджэнне прынятых калгасамі планаў сяўбы зернавых культур па сартах закончыць па паўднёвых раёнах СССР не пазней 15 лютага 1940 г. і па астатніх раёнах — 25 лютага 1940 года, а ў наступныя гады адпаведна — 15 студзеня і 25 студзеня.

9. Абавязаць ЦУНГУ пры Дзяржплане СССР забяспечыць у 1940 годзе па паўднёвых раёнах СССР да 25 лютага і па астатніх раёнах СССР да 5 сакавіка (а ў наступныя гады адпаведна — да 25 студзеня і 5 лютага) учот плана пасеву зернавых культур і фактычнае выкананне гэтага плана па сартах.

10. Прапанаваць Наркамзему СССР прадугледзіць у планах пасеву ўзаржселекстанцый па зліце страхавы фонд у размеры 30 процантаў і ў райнасенгасах па I і II рэпрадукцыі 25 процантаў насення раяніраваных сартоў.

11. Пры наяўнасці ў калгасе сартоў пшаніцы з рэзка рознымі хлебапякарнымі якасцямі план хлебаздачы выконваць сартамі з лепшымі хлебапякарнымі якасцямі.

12. Партыйным, совецкім і земельным органам аказваць калгасам усямерную дапамогу ў арганізацыі планавання сартавых пасеваў, устанавіўшы па кожнаму калгасу тэрміны складання і зацвярджэння агульнымі сходамі калгаснікаў планаў пасеву зернавых культур па сартах.

ЛЕДАКОЛЫ „И. СТАЛИН“ І „СЕДОВ“ ІДУЦЬ ДА РОДНЫХ БЕРАГОЎ

БОРТ ЛЕДАКОЛА «И. СТАЛИН», 16 студзеня (радыё ТАСС). Трое сутак мы правялі борт аб борт з гераічным ледаколам «Седов». Усе гэтыя дні былі запоўнены ўпорнай работай па падрыхтоўцы да зваротнага паходу. Экіпажы абодвух караблёў абавязаліся даставіць «Седова» у родны порт ва ўзорным парадку. Маракі і палярнікі самаадданa працуюць, каб правесці цяжкі рэйс на выдатна, з часцю выканаць другую частку сталінскага задання, поўнасцю апраўдаць высокае давер'е партыі і ўрада.

Бункероўка «Седова» і снабжэнне яго пішчавой валой былі закончаны ў спісныя тэрміны. Асноўная ўвага была звернута на праверку гатоўнасці механізмаў дрэйфаваўшага карабля да яго зваротнага рэйса. На працягу ўсіх дзён стаянкі механікі флагманскага ледакола працавалі, не вылазячы з машыннага аддзялення ледакола «Седов». Разам з седоўцамі яны агледзелі ўсе агрэгаты і падрыхтавалі машыну да работы. Учора, нарэшце, упершыню за апошнія два гады машына «Седова» зноў запрацавала.

Назначаная мною спецыяльная камісія ў саставе капітана флагманскага ледакола тав. Белаусава, капітана тав. Бадзігіна, галоўнага механіка ледакола «И. Сталин» тав. Неупакоева, старшага механіка ледакола «Седов» тав. Трафімава агледзела корпус, механізмы, абсталяванне «Седова» і прызнала, што судно знаходзіцца ў здавальняючым становішчы. Другая камісія, якая складаецца з урачоў тт. Смаленскага, Сергеева і Сабалеўскага, старанна агледзела стан здароўя ўсіх седоўцаў. Як і трэба было чакаць, мужныя палярнікі аказаліся фізічна моцнымі, вынослівымі людзьмі, якія ўладаюць добрым здароўем і вялікай жыццерадаснасцю.

Сёння раніцою мы закончылі апошнюю работу па падрыхтоўцы караблёў да звароткага шляху. Яшчэ напярэдадні вечарам вінт і руль «Седова» былі вызвалены ад намёрзшага на іх ільду.

Сёння флагманскі ледакол акалоў краі лёдавай чашы, у якую ўмёрз корпус «Седова». У 16 гадзін. даўнія развітальныя гудкі, ледакол «И. Сталин» крануўся ў зваротны шлях. За ім на кароткім буксіры ідзе гераічны «Седов». Зноў мы прабіваемся ў цяжкіх, згуртаваных ільдах, шукаючы дароту з дапамогаю моцных пражэктараў.

Перад адпраўленнем у шлях да берагоў радзімы экіпаж «Седова» ў поўным саставе на чале з капітанам тав. Бадзігіным зышоў на лёд. Яны неслі чырвоны сцяг, на якім буйнымі літарамі начэртана: **СТАЛИН.** Ніжэй указаны каардынаты апошняй стаянкі «Седова» і даты, адзначаючыя пачатак і канец бясприкладнага дрэйфа слаўнага совецкага карабля.

Седоўцы спынiліся ля высокага рапака. Капітан тав. Бадзігін уткнуў дрэўка сцяга ў снег. Чырвоны сцяг затрапятаў на марозным ветру. Тав. Бадзігін сказаў кароткую прамову. Ён гаварыў аб радзіме, аб партыі, аб вялікім Сталіне, з імёнем якога совецкія маракі перамагаюць любыя труднасці, атрымліваюць перамогі над стыхіяй, пакараюць прыроду. Потым раздаўся ўрачысты салют, і седоўцы вярнуліся на карабль.

Ледаколы «И. Сталин» і «Седов» пайшлі на поўдзень. А над лёдавай пустыняй горда развявалася сцяг з імёнем вялікага Сталіна, адзначаючы месца, дзе 15 слаўных храбрацоў жылі і змагаліся на карысць цухоўнай радзімы з імёнем любімага правадыра ў сэрцы. Гэты сцяг, таксама, як і сцяг, пакінуты на месцы зняцця дрэйфуючай станцыі «Паўночны полюс», сімвалізуе нашу любоў і адданасць партыі, радзіме, таварышу Сталіну, пад кіраўніцтвам якога большэвікі перамагаюць усе труднасці.

Зараз мы ідзем да кромкі ільду, дзе сустрэнемся з параходам «Сталинград». Ён снабзіць нас вугалем і вадой. Пасля бункероўкі абодва ледаколы зойдуць у Барэнцбург. Там перад дальнім пераходам па адкрытаму мору вадалазы агледзяць падводную частку корпуса «Седова».

І. Д. ПАПАНІН.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЛЕНІНСКІХ ДЗЁН

На ўсіх прадпрыемствах сталіцы БССР разгарнулася падрыхтоўка да 16-й гадавіны з дня смерці геніяльнага правадыра прапоўных Владзіміра Ільіча Леніна. У цэхах, зменах і брыгадах фабрык і заводаў праводзяцца гутаркі аб жыцці і дзейнасці Ільіча. У клубах і бібліятэках арганізуюцца выстаўкі фота і літаратуры.

40 агітатараў вылучаны партыйнай арганізацыяй станкабудаўнічага завода імені Варашылава для правядзення гутарак аб Леніне ў цэхах завода і на былым выбарчым участку. Ва ўсіх цэхах рыхтуюцца спецыяльныя выпускі насценных газет, прысвечаных памяці В. І. Леніна. У клубе завода наладжана выстаўка, якая адлюстроўвае выдатную рэволюцыйную дзейнасць правадыра. 22 студзеня ў клубе адбудзецца жалобны вечар рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых завода, на якім будзе зроблен даклад на тэму: «16 год без Леніна па ленінскаму шляху пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна».

Гутаркі аб жыцці і рэволюцыйнай дзейнасці В. І. Леніна праводзяцца ва ўсіх цэхах станкабудаўнічага завода імені Кірава. Агітатары карыстаюцца ўрыўкамі з мастацкіх твораў, рысуючых вобраз вялікага правадыра.

Партарганізацыя абутковай фабрыкі імені Кагановіча арганізуе жалобны сход хатніх гаспадынь былога выбарчага ўчастка. Намечаны таксама экскурсіі рабочых і хатніх гаспадынь на ленінскую выстаўку ў Дом партыйнага актыва і ў Музей рэволюцыі БССР.

***

Выстаўка твораў Ільіча і літаратуры аб ім адкрыта ў мінскім Медыцынскім інстытуце. Тут прадстаўлены важнейшыя работы Леніна і Сталіна, узбагаціўшыя скарбніцу марксізма-ленінізма.

У дапамогу прапагандыстам

Развіццё Леніным марксісцкай тэорыі пазнання

К. Маркс і Ф. Энгельс, апіраючыся на навуковыя дасягненні папярэдняга развіцця філасофіі і прыродазнаўства, заклалі моцны фундамент дыялектыка-матэрыялістычнай тэорыі пазнання. В. І. Ленін падверг далейшай распрацоўцы асноўныя пытанні гэтай тэорыі.

У распрацоўцы тэорыі пазнання Ленін выходзіў з вядомага палажэння Энгельса аб тым, што асноўным пытаннем усякай філасофіі з'яўляецца пытанне аб адносінах мышлення да быцця, сазнання да матэрыі. Гэта іменна і ёсць тое карэннае пытанне, якое праводзіць найбольш глыбокі водападзел паміж рознымі філасофскімі сістэмамі. Тое ці іншае вырашэнне яго служыць выходным пунктам тэорыі пазнання і вызначае характар светапогляду. У залежнасці ад адказу на гэтае пытанне філосафы падзяляліся на два процілеглыя лагеры: лагер матэрыялістаў і лагер ідэалістаў.

Матэрыялізм, у поўнай згодзе з навукай і практычным перакананнем людзей, прызнае першічным, першапачаткова існуючым — прыроду, матэрыю; мышленне-ж лічыць утарычным і вытворным. З пункту гледжання матэрыялізма прырода існуе незалежна ад сазнання, якое разглядаецца як прадукт матэрыі. Сазнанне-ж у сваім існаванні залежыць ад матэрыі і з'яўляецца толькі адлюстраваннем быцця.

У прымяненні да грамадства гэта азначае, што грамадскае сазнанне вызначаецца грамадскім быццём. «Якое быццё грамадства, якія ўмовы матэрыяльнага жыцця грамадства,—такія яго ідэі, тэорыі, палітычныя поглядзы, палітычныя ўстановы». («Гісторыя ВКП(б)», стар. 110). Адсюль зразумела, што змяненне грамадскіх ідэй, палітычных поглядаў і ўстаноў можа адбыцца толькі ў выніку карэннага пераўтварэння ўмоў матэрыяльнага жыцця грамадства. Значыць, партыя пралетарыята ў сваёй палітыцы павінна выходзіць не з адцягненых прынцыпаў, а з рэальных патрэбнасцей развіцця матэрыяльнага жыцця грамадства. «Сіла і жыццёвасць маркэізма-ленінізма заключаецца ў тым, што ён апіраецца ў сваёй практычнай дзейнасці іменна на патрэбнасці развіцця матэрыяльнага жыцця грамадства, ніколі не адрываючыся ад рэальнага жыцця грамадства» («Гісторыя ВКП(б)», стар. 111). Такое значэнне асноўнага палажэння марксісцкага матэрыялізма для практычнай рэволюцыйнай дзейнасці.

У процілегласць навукова абгрунтаванаму погляду матэрыялізма ідэалізм сцвярджае бязглуздае палажэнне, што сазнанне існуе незалежна ад матэрыі і з'яўляецца першапрычынай усяго існуючага. Прырода-ж у ідэалістаў або растварэцца ў суб'ектыўным успрыманні чалавека, або аб'яўляецца простым выяўленнем нейкага аб'ектыўнага духу.

Пытанне аб адносінах мышлення да быцця мае і іншую сваю сторану, а іменна: ці здольна наша мышленне пазнаваць рэчаіснасць? І ў даным выпадку філосафы ўтварылі дзве плыні: адна з іх прызнае, што акружаючы нас свет пазнаваем, што нашаму пазнанню даступна сапраўдная прырода рэчаў, што свет у рэальнай аб'ектыўнай рэчаіснасці — такі, якім ён праўстаўляецца нам праз нашы адчуванні і паняцці; другая — адмаўляе магчымасць такога пазнання свету і сцвярджае яго непазнавальнасць. Гэтая другая плынь называецца агностыцызмам. Стараннікамі апошняга былі Юм, Кант і рад іншых філосафаў-ідэалістаў. Усякі агностык адмаўляе навуку і замест ведаў і практычнай барацьбы прапаведуе веру.

«Марксісцкі філасофскі матэрыялізм выходзіць з таго, што свет і яго заканамернасці ўпаўне пазнаваемы, што нашы веды аб законах прыроды, праверяныя вопытам, практыкай, з'яўляюцца даставерными ведамі, якія маюць значэнне аб'ектыўных ісцін, што няма ў свеце непазнаваемых рэчаў, а ёсць толькі рэчы яшчэ непазнаныя, якія будуць раскрыты і пазнаны сіламі навукі і практыкі» («Гісторыя ВКП(б)», стар. 108). У прымяненні да грамадства гэта азначае, што і грамадскае жыццё таксама пазнаваема, што даныя навукі аб законах развіцця грамадства з'яўляюцца даставерными, маючымі значэнне аб'ектыўных ісцін. Маркс і Энгельс, прымяніўшы палажэнні дыялектычнага матэрыялізма да жыцця грамадства, стварылі гістарычны матэрыялізм і тым самым ператварылі сацыялізм з утопіі ў навуку. Кіруючыся прынцыпамі дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма, наша партыя ў сваёй практычнай дзейнасці заўсёды выходзіла з аб'ектыўных законаў развіцця грамадства і таму атрымлівала ўсё новыя і новыя перамогі.

***

Ленін з асаблівай сілай падкрэсліваў неабходнасць чоткага размежавання двух процілеглых партый у філасофіі. Ленін бязлітасна бічаваў якое-б то ні было «засмечванне сутнасці пытання вычурнымі ўхільчэннямі». Усякія патугі выскачыць з гэтых карэнных напрамкаў Ленін клейміў як «прымірэнчае шарлатанства». З геніяльным майстэрствам ён выкрываў «прэзрэнную партыю сярэдзіны» як у палітыцы, так і ў філасофіі. Кіруючыся прынцыпам партыйнасці, Ленін ускрыў асноўны манеўр махістаў і іх рускіх паслядышаў, выступіўшых з тупавумнымі прэтэнзіямі пераўзыйсці быццам-бы «ўстарэлае» проціпастаўленне двух партый у філасофіі. Спробы ўзвысіцца над барацьбой паміж матэрыялізмам і ідэалізмам, або прымірыць іх уяўлялі сабой ні што іншае, як замаскіраваную ўлоўку для працягвання рэакцыйнай ідэалістычнай філасофіі.

Ленін змагаўся як супроць утоясамлення сазнання і быцця, так і супроць адрыву мыслі ад матэрыі, падкрэсліваючы абсалютнае значэнне іх процілегласці выключна толькі ў рамках асноўнага пытання аб тым, што прызнаць першічным і што другарадным. «За гэтымі прэдзеламі — пісаў Ленін — аперыраваць з процілегласцю матэрыі і духу, фізічнага і псіхічнага, як з абсалютнай процілегласцю, было-б велізарнай памылкай». (Ленін, т. XIII, стар. 201).

Геніяльнае асвятленне асноўнага пытання філасофіі даў таварыш Сталін у сваёй рабоце «Анархізм ці сацыялізм». «Адзіная і непадзельная прырода,—пісаў таварыш Сталін, — выражаная ў двух розных формах — у ідэальнай і матэрыяльнай, — вось як нам трэба глядзець на развіццё прыроды. Адзінае і непадзельнае жыццё, выражанае ў двух розных формах — у ідэальнай і матэрыяльнай, — вось як трэба нам глядзець на развіццё жыцця. Такі манізм матэрыялістычнай тэорыі Маркса» (Берыя, «Да пытання аб гісторыі большэвіцкіх арганізацый у Закаўказзі», стар. 79. Партвыдат, 1936 г.).

Марксісцкі філасофскі матэрыялізм адстойвае дыялектычнае адзінства мышлення і быцця. Гэта не значыць, што ўся прырода спершапачатку надзелена здольнасцю адчуваць або мысліць. Гэта толькі азначае, што здольнасць да сазнання не прыўносіцца ў прыроду звонку, а немінуча ўзнікае з яе, як прадукт праняглага развіцця свету, як уласцівасць высока арганізаванай матэрыі.

Развіваючы пытанне аб узнікненні здольнасці мышлення, Ленін падкрэсліваў складаны, дыялектычны характар пераходу ад матэрыі да сазнання. У паш час павука не настолькі яшчэ моцная, каб аб'ясніць, якім чынам уздзеянне матэрыі на нашы органы адчування ператвараецца ў факт сазнання. Ставячы гэтае пытанне, Ленін падкрэсліваў, што «...на справе астаецца яшчэ даследаваць і даследаваць, якім чынам звязваецца матэрыя, пібы не адчуваючая зусім, з матэрыяй з тых-жа атамаў (або электронаў), складзенай і ў той-жа час уладаючай ясна выражанай здольнасцю адчування. Матэрыялізм ясна ставіць нявырашанае яшчэ пытанне і тым штурхае да яго вырашэння, штурхае да далейшых эксперыментальных даследаванняў» (Ленін, т. XIII. стар. 37).

Аднак сучаснае прыродазнаўства ўжо накапіла нямала навуковых даных, якія раскрываюць сувязь нашых адчуванняў з паўнымі працэсамі, якія адбываюцца ў мазгу і ва ўсім арганізме чалавека. Вядома, што здольнасць адчування не складае выключную прывілегію толькі чалавека, яна ўласціва ўсёй «жывой матэрыі». Ужо на першапачатковых ступенях развіцця арганічнай матэрыі мы сустракаемся з найпрасцейшымі формамі адчуванняў, як раздражымасць, скарачаемасць і т. п.

Развіццё больш высокіх форм адчуванняў абумоўлена ўзнікненнем жывых істот, надзеленых спецыяльнымі органамі пачуццяў, нервовай сістэмай і, нарэшце, мозгам. Значыцца, чалавечае адчуванне, мышленне, выступаюць як прадукт праняглага развіцця асаблівым чынам арганізаванай матэрыі. Ужо вышэйшым жывёлам уласцівы пачатковыя формы мысліцельнай дзейнасці. Аднак, вышэйшага свайго развіцця мышленне дасягае толькі ў чалавека, толькі на аснове грамадска-гістарычнай вытворчай дзейнасці людзей. Гэта робіць чалавечае мышленне прынцыповым чынам адметным ад здольнасці жывёл да мыслення.

Што-ж датычыць неарганічнай прыроды, то мы можам «толькі меркаваць існаванне здольнасці, сходнай з адчуваннем» (Ленін). Ставячы гэтае пытанне, Ленін робіць наступнае дапушчэнне: «лагічна меркаваць, што ўся матэрыя валодае ўласцівасцю, па-сутнасці родственай з адчуваннем, уласцівасцю атражэння». Уласцівасць атражэння, якая абумоўлена ўзаемадзеяннем матэрыяльнай рэчаіснасці, па меркаванню Леніна, з'яўляецца ўсеагульнай уласцівасцю матэрыі, з якой шляхам праняглага развіцця ўзнікла адчуванне.

Гэта незвычайна смелая ленінская пастаноўка пытання заключае ў сабе далейшае развіццё асноўнага пытання марксісцкага філасофскага матэрыялізма. Разам з тым, яна дае ключ для прыродазнаўства ў раскрыцці фізічных, біяхімічных і фізіялагічных прадпасылак адчування.

Ф. Энгельс падкрэсліваў, што найістотнейшай і першай асновай чалавечага мышлення з'яўляецца змяненне прыроды чалавекам, а не адна прырода, як такая, і розум чалавека развіваўся па меры таго, як ён навучаўся змяняць прыроду. У сваю чаргу сазнанне, у якасці неабходнага моманту, уключаецца ў працэс матэрыяльнай дзейнасці людзей, накіраванай на пераўтварэнне свету. Адсюль вынікае велізарнае мабілізуючае, арганізуючае і пераўтвараючае значэнне перадавой тэорыі ў грамадскім развіцці.

***

Адстойваючы тэарэтычныя асновы марксізма, Ленін распрацоўвае ва ўсёй грандыёзнасці тэорыю адлюстравання. «У аснове тэорыі пазнання дыялектычнага матэрыялізма, — пісаў Ленін, — ляжыць прызнанне знешняга свету і адлюстраванне яго ў чалавечай галаве» (Ленін, т. XIII, стар. 5).

Нашы адчуванні, уяўленні і паняцці ёсць сапраўдныя копіі, мысліцельныя вобразы, здымкі з прыроды. Працэс пазнання ёсць не што іншае, як адлюстраванне аб'ектыўнага свету ў суб'ектыўным сазнанні чалавека.

З пункту гледжання марксісцкага матэрыялізма адчуванне ёсць рэзультат узлзеяння аб'ектыўнага свету на нашы органы пачуццяў. Як непасрэднае ўспрыняцце рачаіснасці, адчуванне з'яўляецца крыніцай нашага пазнання. «Усе веды з вопыту, з адчуванняў, з успрыняццяў» (Ленін).

У сваім пазнанні мы пачынаем з адчуванняў. Аднак адчуванне — гэта толькі пачатковая ступень пазнання. Дыялектычны матэрыялізм падкрэслівае складаны супярэчлівы характар працэсу пазнання, якое праходзіць у сваім развіцці рад ступеней. У працэсе пазнання мы ідзем ад непасрэднага сузірання да тэарэтычнага мышлення, а ад яго да практыкі.

Прырода ў сваім вечным існаванні і развіцці бясконца складана і разнастайна. Адносіны розных бакоў і сувязей прыроды супярэчлівы. Сутнасць прадметаў і форма іх праяўлення не супадаюць. Адсюль задача навуковага пазнання зводзіцца да тэго, каб за з'явамі ўскрыць сутнасць, у адзінкавым знайсці агульнае, за рэчамі выявіць іх адносіны, у назіраемых зменнях устанавіць закон развіцця і т. д. Пазнанне і ёсць працэс пагружэння чалавечага розуму ў прыроду «дзеля падпарадкавання яе ўладзе суб'екта» (Ленін).

У непасрэдным ўспрыманні рачаіснасці людзі абмежаваны ў сваім пазнанні і парадка прыходзяць да памылковых поглядаў. Наша вока, напрыклад, успрымае хвалі святла толькі пэўнай даўжыні. Часам нашыя адчуванні няправільна перадаюць сапраўдныя ўласцівасці прадметаў, скажаюць іх. Так, напрыклад, кій, апушчаны ў ваду, здаецца нам паламаным. Нам здаецца, што сонца рухаецца вакол зямлі, і т. д. Абмен рэчаў пры капіталізме скрывае грамадскія адносіны людзей, форма зарплаты затушоўвае сутнасць эксплаатацыі, грошы здаюцца крыніцай багацця і т. д.

У сваіх адчуваннях мы маем справу з уяўленнямі аб адзінкавых канкрэтных рэчах і з'явах. Устанавіць-жа прычынную сувязь і заканамернасць з'яў можна толькі пры дапамозе тэарэтычнага мыслення і на аснове практыкі.

Для мыслення характэрна абстрагіраванне ад выпадковых адзінкавых з'яў і выдзяленне найбольш істотных бакоў і сувязей рэчаіснасці. У рэзультаце мы прыходзім да абагуленага разумення прадметаў і з'яў, да ўтварэння паняццяў, катэгорый і законаў, як найбольш глыбокіх і агульных вызначэнняў рачаіснасці. Ленін указвае, што «ужо самае простае абагульненне... азначае пазнанне чалавекам усё больш і больш глыбокай, аб'ектыўнай сувязі свету» (Ленін, Філасофскія сшыткі. стар. 173). Шляхам утварэння такіх паняццяў, як, напрыклад, паняцце матэрыі, вартасці і т. п., мы пагыбляемся ў пазнанне законаў развіцця аб'ектыўнага свету. «Мышленне, — піша Ленін, —узыходзячы ад канкрэтнага да абстрактнага, не адыходзіць — калі яно правільнае... — ад ісціны, а падыходзіць да яе. Абстракцыя **матэрыі, закона**, прыроды, абстракцыя **вартасці** і т. д., адным словам усе навуковыя (правільныя, сур'ёзныя, не бязглуздыя) абстракцыі адлюстроўваюць прыроду глыбей, вярней, **паўней**» (Ленін, Філасофскія сшыткі. стар. 166).

Перавага адчуванняў, у адрозненне ад агульных паняццяў, заключаецца ў тым, што яны больш жыва і непасрэдна перадаюць разнастайнасць матэрыяльнага свету. Затое абстрактнае паняцце адрозніваецца ад непасрэдных успрыманняў сваёй глыбінёй і паўнатой ахвату аб'ектыўных сувязей і адносін рэчаіснасці. І чым глыбей праніканне чалавека ў заканамерную сувязь з'яў, тым манней яго ўлада над сіламі прыроды. Пазнанне законаў развіцця капіталізма з'яўляецца адною з неабходных умоў паспяховай барацьбы з ім. Вось чаму веданне законаў грамадскага развіцця і палітычнай барацьбы, устанаўляемае марксісцка-ленінскай навукай, дае найвялікшую сілу працоўным масам у іх рэволюцыйнай барацьбе за таржаство комунізма. Адсюль зразумела, наколькі важна авалоданне марксісцка-ленінскай тэорыяй, як найвялікшай зброяй у справе пазнання і рэволюцыйнага пераўтварэння свету.

Такі шлях пераходу ад адчуванняў да мыслі. Трэба мець на ўвазе, што ўказаныя ступені неаддзялімы адна ад другой і выступаюць як дзве стораны адзінага дыялектычнага працэса пазнання.

Далейшая ступень у навуковым пазнанні звязана з праверкай здабытых ведаў чалавечай практыкай. «Ад жывога сузірання, — пісаў Ленін, — да абстрактнага мыслення і ад яго да практыкі, — такі дыялектычны шлях пазнання ісціны, пазнання аб'ектыўнай рэальнасці» (Ленін, Філасофскія сшыткі. стар. 166).

***

У абгрунтаванні пазнаваемасці свету і яго законаў марксісцкі матэрыялізм выходзіць з таго факта, што чалавечае мышленне ёсць уласцівасць высока арганізаванай матэрыі, і, значыцца, у сваіх канечных рэзультатах не можа не супадаць з аб'ектыўнай рэчаіснасцю.

Рашаючае-ж сваё пацвярджэнне марксісцка-ленінская тэорыя пазнання знаходзіць у практыцы, у грамадска-гістарычнай дзейнасці людзей. Пытанне аб ролі практыкі з'яўляецца асноўным у тэорыі пазнання. У сваёй кнізе «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм» Ленін з асаблівай сілай падкрэсліў значэнне практыкі ў вырашэнні асноўных тэарэтыка-пазнавальных пытанняў.

Махісты, ігнаруючы практыку, расчышчалі шлях для агностыцызма і ідэалізма. Ускрываючы манеўр махістаў, Ленін пісаў: «Пункт гледжання жыцця, практыкі павінен быць першым і асноўным пунктам гледжання тэорыі пазнання. І ён прывядзіць немінуча да матэрыялізма, адкідваючы з парога бясконцыя вымыслы прафесарскай схаластыкі» (Ленін, там-жа, стар. 116).

Поспехі практыкі з'яўляюцца гарантыяй правільнасці тэорыі. Наша ўпэўненасць у праваце і ўсёперамагаючай сіле марксісцка-ленінскай тэорыі пацвярджаецца ўсім ходам рэволюцыйнай барацьбы міжнароднага пролетарыята, пацвярджаецца фактам таржаства вялікіх ідэй Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна ў працэсе сацыялістычнай рэволюцыі і пабудовы сацыялізма ў СССР.

Марксісцка-ленінская тэорыя пазнання пад практыкай разумее ўсю сукупнасць чалавечай дзейнасці, вытворчую дзейнасць, рэволюцыйную барацьбу, практыку навуковых даследаванняў і т. д. Грамадска-гістарычная практыка гэта не толькі крытэрый ісціны, не толькі сродак авалодання законамі прыроды, але і шлях рэволюцыйнага пераўтварэння грамадства. Грамадска-гістарычная практыка служыць асновай для тэарэтычнага пазнання. Але сама практычная дзейнасць людзей мае патрэбу ў тэарэтычным абагуленні. Без гэтага нямысліма рэволюцыйная барацьба.

Дыялектычны матэрыялізм адстойвае адзінства тэорыі і практыкі. У гэтым ён бачыць залог поспеху практычнай рэволюцыйнай барацьбы і тэарэтычнага пазнання.

Тэорыя выступае, як абагульненне практыкі, абагульненне законаў развіцця прыроды і грамадства. З пашырэннем вопыту, практыкі ўзбагачаецца і тэорыя, калі яна не адрываецца ад жыцця, калі яна ставіць сваёй мэтай служэнне рэволюцыйным патрэбнасцям, практычнай барацьбе.

Неразрыўная сувязь тэорыі з практыкай — такая сутнасць марксізма-ленінізма, такі кіруючы прынцып большэвіцкай партыі. У спалучэнні з практыкай тэорыя авалодваючы масамі, робіцца найвялікшай сілай.

«Сіла і жыццёвасць марксізма-ленінізма заключаецца ў тым, што ён апіраецца на перадавую тэорыю, правільна адлюстроўваючую патрэбнасць развіцця матэрыяльнага жыцця грамадства, паднімае тэорыю на палабаючую ёй вышыню і лічыць сваім абавязкам выкарыстаць да дна яе мабілізуючую, арганізуючую і пераўтвараючую сілу» («Гісторыя ВКП(б)», стар. 112).

«Эканамісты» і меншавікі, якія адмаўлялі значэнне перадавой тэорыі для рэволюцыйнай барацьбы, асуджалі партыю пролетарыята на пасіўнасць, на празябанне.

Тэарэтыкі і правадыры нашай партыі— Ленін і Сталін, апіраючыся на рэволюцыйную практыку, вушлі далей марксісцкую тэорыю і ўзбагачаюць яе новым вопытам у новых умовах класавай барацьбы. Адным з найярчэйшых узораў творчага развіцця марксісцка-ленінскай тэорыі з'яўляецца даклад таварыша Сталіна на XVIII з'ездзе партыі. У сваім дакладзе таварыш Сталін падвёў вынікі грандыёзных перамог Комуністычнай партыі, абагуліў гіганцкі вопыт пабудовы сацыялізма ў СССР, вопыт усёй сусветнай гісторыі. Таварыш Сталін па-новаму паставіў і распрацаваў пытанне аб дзяржаве ва ўмовах капіталістычнага акружэння, стварыў закончаную тэорыю сацыялістычнай дзяржавы. Новая тэорыя, створаная сталінскім геніем, натхняе тружанікаў сацыялістычнага грамадства на новыя гераічныя справы.

***

На прыкладзе аналіза навейшых даных прыродазнаўства, у прыватнасці фізікі, Ленін, разгарнуў сваё вучэнне аб дыялектыцы працэса пазнання. Слеэуючы Энгельсу, Ленін перш за ўсё адкідвае кантыянскую недарэчную ідэю аб прынцыповай грані паміж з'явай і «рэччу ў сабе». Для Канта, як агностыка, характэрна адмаўленне аб'ектыўнай заканамернасці прыроды і вывядзенне прынцыпаў нашага пазнання з чалавечага сазнання, а не з аб'ектыўнай рэальнасці. «Чалавек дае законы прыродзе, а не прырода чалавеку—такая прамудрасць кантыянства, падтрымліваемая Махам і Авенарыусам і іх рускімі паслядышамі. Ленін паказвае, што ў працэсе пазнання мы ідзем ад няведання да ведаў. Непазнанае на адным этапе становіцца пазнаным на другім. Кантаўскі разрыў паміж з'явай і сутнасцю рэчаў Ленін абвяргае спасыланнем на грамадска-гістарычную практыку, у працэсе якой мы адкрываем усё новыя і новыя ўласцівасці прадметаў, прыроды, падпарадкуючы яе ўладзе чалавека.

Гісторыя навук паказвае бясконцы працэс паглыблення пазнання чалавекам унутраных заканамернасцей прыроды. Бясконцасць працэса пазнання абумоўлена, з аднаго боку, бясконцасцю самога прадмета пазнання, а з другога боку — бязмежнымі магчымасцямі чалавечага пазнання. З пункту гледжання магчымасці пазнання чалавечае мышленне беспрадзельна. Але на кожным даным этапе людзі абмежаваны ў сваім пазнанні прыроды ўмовамі сваёй эпохі, паўным узроўнем развіцця прадукцыйных сіл, становішчам навук і інш.

У даной сувязі Ленін развівае пытанне аб адноснай і абсалютнай аб'ектыўнай ісціне. «З пункту гледжання сучаснага матэрыялізма, г. зн. марксізма, — піша Ленін, — гістарычна ўмоўны межы, набліжэння нашых ведаў да аб'ектыўнай, абсалютнай ісціны, але безумоўна існаванне гэтай ісціны, безумоўна тое, што мы набліжаемся да яе... Гістарычна ўмоўна тое, калі і пры якіх умовах мы пасунуліся ў сваім пазнанні сутнасці рэчаў да адкрыцця алізарына ў каменна-вугальным дзёгці або да адкрыцця электронаў у атаме, але безумоўна тое, што кожнае такое адкрыццё ёсць крок наперад «безумоўна аб'ектыўнага пазнання» (Ленін, т. XIII, стар. 111).

Ленінскае вучэнне аб аб'ектыўнай ісціне з'явілася найвялікшай сілай у руках комуністычнай партыі. Наша партыя ў сваёй практычнай рэволюцыйнай дзейнасці заўсёды выходзіла з аб'ектыўных законаў грамадскага развіцця і адпаведна гэтаму вызначала сваю лінію палітычнай барацьбы. Гэта з'явілася адною з умоў, забяспечваючых поўнае таржаство генеральнай лініі большэвіцкай партыі.

Марксісцка-ленінская тэорыя пазнання атрымала сваё далейшае развіццё ў працах таварыша Сталіна. Яе значэнне для практычнай дзейнасці нашай партыі выключна вялікае. Марксісцка-ленінская тэорыя пазнання заўсёды надавала рэволюцыйнаму руху ўпэўненасць, сілу арыентыровкі і разуменне ўнутранай сувязі акружаючых падзей.

І. М. ІЛЬЮШЫН.

ТЭКСТЫЛЬНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ БСС У 1940 ГОДЗЕ

На падставе партыі і ўрада тэкстыльная прамысловасць БССР вылучена з лёгкай прамысловасці ў самастойную галіну. Для кіраўніцтва ёю ў верасні 1939 года быў створан Народны Камісарыят тэкстыльнай прамысловасці БССР. Наркамату перададены 82 заводы пярвічнай апрацоўкі ільну і трасты, дзве ільнопрадзільныя фабрыкі, суконная фабрыка, ватная і ткацкая баваўняная.

Аналіз работы тэкстыльнай прамысловасці за 1939 год паказвае, што тут ёсць такія галіны, якія сістэматычна не выконваюць вытворчых планаў, цягнуць уніз выкананне агульнага плана па наркамату. Да іх адносіцца ільняная і баваўняная прамысловасць. Асабліва дрэнна працуе Віцебская ільнопрадзільная фабрыка імені Л. М. Кагановіча і «Дняпроўская мануфактура» (Дуброўна). Першая з іх выканала свой гадавы план на 87.5 проц., другая — на 94.2 проц. Невыкананне плана гэтымі фабрыкамі дала ў канчатковым выніку недавыкананне плана ўсёй прамысловасцю. План 1939 года выкананы на 99.85 проц.

Памятаючы ўказанні таварыша Молатава аб тым, што тэкстыльшчыкі павінны пакончыць з адставаннем, нам залача ў 1940 годзе — вывесці тэкстыльную прамысловасць Беларусі ў рады перадавікоў. Для гэтага мы намецілі рад канкрэтных мерапрыемстваў па ўмацаванню кіраўніцтва фабрыкамі, паляпшэнню тэхналагічнага працэса, упарадкаванню справы снабжэння прадпрыемстваў сыравінай, чалівам і іншымі матэрыяламі.

У 1940 годзе намячаецца значны рост валавой прадукцыі па наркамату. Усяго будзе выпушчана прадукцыі (без Беластоцкага тэкстыльнага трэста) на 32.7 мільёна рублёў — на 16,3 процанта больш чым у мінулым годзе. Прадпрыемствы наркамата дадуць 27 тысяч тон ільнянога і пенькавага валакна, 9.100 тысяч метраў баваўняных тканін, 2.540 тысяч метраў ільняных і іншых відаў тканін.

У 1940 годзе неабходна карэнна палепшыць тэхналагічны працэс па пяровічнай апрацоўцы ільну. Асобую ўвагу неабходна ўдзяліць сарціроўцы трасты ва ўсіх працэсах—ад пераблення да паступлення ў турбіну ільнозавода. Гэта дазволіць значна павялічыць нумарнасць новалакна, павысіць яго якасць.

Вялікая работа будзе праведзена рэканструкцыі і абнаўленню абсталявання прадпрыемстваў. Капіталаўкладанні гэтым годзе асігнуецца 3,1 мільёна рублёў. Рэканструяруецца рад ільнозаводаў, заканчваецца збудаванне высоковольтнай лініі для падачы энергіі Якаўлевіцкай канапляной фабрыцы. На фабрыцы імя Кагановіча будзе абсталяван новы часальцэх, пераабсталявана вентыляцыйная сістэма, устаноўлены новыя машыны-аўтаматы, пушчаны новыя 2.500 верацён.

Наркамату перададены нацыянал'заваныя ў заходніх абласцях БССР тэкстыльныя фабрыкі. Яны слаба тэхнічна аснашчаны і патрабуюць да сябе выключнай увагі. Для кіраўніцтва гэтымі прадпрыемствамі ў Беластоку створан тэкстыльны трэст. Наша задача — у найкарацейшы тэрмін навесці на тэкстыльных фабрыках заходніх абласцей БССР парадак і арганізаваць працу рабочых, каб забяспечыць высокую прадукцыйнасць. Трэст ужо праводзіць работу па ўвядзенню новага асартымента, перавядзе сістэмы аплаты працы і паляпшэнню аховы працы.

Прадпрыемствы Беластоцкага трэста ўжо рэканструяваны. На 1940 год пачата ўкладзі ў гэту справу звыш мільёнаў рублёў, з іх значная сума пойдзе на паляпшэнне ўмоў працы. Так, на ўстаноўку агарожаў машын будзе выходавана звыш 700 тысяч рублёў, асвятленне і вентыляцыю — звыш адзін мільёна рублёў і т. д.

У 1940 годзе прадпрыемствы Беластоцкага трэста выпусцяць 10.5 мільёна метраў суконных тканін, поўмільёна квадратных метраў плюшавых тканін і мільён квадратных ватына.

Апрача таго ў 1940 годзе ў Беластоку намячаецца будаўніцтва прадпрыемства баваўняной фабрыкі на 10 тысяч верацён.

Тэкстыльшчыкі БССР павінны ў 1940 годзе рашуча перабудаваць сваю работу. Нам прадстаіць сур'ёзны экзамен, як на пастойнай галіне народнай гаспадаркі рэспублікі, і мы павінны гэты экзамен вытрымаць з часпю.

Народны Камісар тэкстыльнай прамысловасці БССР К. Г. АЛЯКСЕЕЎ.

ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЕМ ПЛАН ЛЕСАЗАГАТОВАК І ЛЕСАВЫВАЗКІ

Гэтымі днямі адбымася нарада старшынь калгасаў і прадстаўнікоў выканкомаў сельсаветаў Лельчыцкага раёна. Палескай вобласці, па пытанню аб выкананні плана лесазагатовак і лесавывазкі. Нарада абмеркавала зварот брыгады возчыкаў тав. Ганчаронка, Асіповіцкага раёна, і прыняла рад абавязацельстваў, накіраваных на датэрміновае выкананне плана лесазагатовак і лесавывазкі першага квартала і 1940 года. У прынятым нарадай рашэнні гаворыцца:

— Выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных наш раён азнаменаваў стопрацантным выкананнем плана 4-га квартала 1939 года па лесазагатоўках і лесавывазцы. Атрыманыя поспехі з'яўляюцца рэзультатам актыўнай работы калгаснікаў раёна на лесазагатоўках. Глускавіцкі калгас «Пабеда» ў чацвертым квартале загатовіў 2.990 і вывез 2.068 кубаметраў дравіны. Такіх-жа поспехаў дабіліся многія калгасы раёна.

Сабраўшыся на раённую нараду старшыні калгасаў і выканкомаў сельсоветаў і абмеркаваўшы зварот калгаснікаў калгаса «Дубрава», Асіповіцкага раёна, мы шырэй падхопім іх пачын. Мы абавяжамся ў кожным калгасе арганізаваць стаянныя брыгады лесарубаў і возчыкаў замацаваўшы іх для работы ў лесе ўвесь зімовы сезон. Для ўдзелу ў працяглай вытворчасці працы мы выдзелім на кожную звяно па тры калгаснікі для навалкі звалкі лесу, выдзелім адказных брыгадзіраў для лепшай арганізацыі працы.

Прыняты па раёну план у колькасці 47 тыс. кубаметраў дравіны мы павялічым і зробім усё, што будзе залежаць ад нас, каб выканаць датэрмінова да 1 снежня 1940 г. і звяртаемся да ўсіх калгасаў Палескай вобласці пайсці ў гэтым спаборніцтве і ініцыятыву па арганізацыі датэрміновага выканання плана ў 19 годзе для работы на лесавывазцы і забяспечыць датэрміновае выкананне плана ў 19 годзе.

Своечасовым выкананнем плана загатовак і лесавывазкі яшчэ больш умацуем магутнасць і абароназдольнасць нашай сацыялістычнай радзімы.

Пастанову падпісалі старшыні калгасаў і выканкомаў сельсоветаў Лельчыцкага раёна.

АРГАНІЗАЦЫЯ ЛЕСПРАМГАСАЎ У ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ БС

Для скарыстання вялікіх лясных багацццяў заходніх абласцей БССР Наркамлес арганізаваў у Лідзе, Пінску і Беластоку лесазагатоўчыя трасты, а ў раёнах— 34 леспрамгасы.

Для падрыхтоўкі работнікаў новастворанных трэстаў і леспрамгасаў арганізаваны рад курсаў: бухгалтараў—на 175 чалавек, работнікаў статыстыкі і планавікоў— на 250 чалавек, работнікаў падсочкі 240 чалавек.

У леспрамгасы і трэсты заходніх цей накіравана больш 100 спецыялі з іх 80 інжынераў.

Ва ўсіх леспрамгасах пачалася за ка і вывазка лесаматэрыялаў. За пе дэкаду студзеня загатоўлена 84 тыс вывезена 36 тысяч кубаметраў лес

НАВЕСЦІ БОЛЬШЭВІЦКІ ПАРАДАК Ў КААПЕРАЦЫІ ПАЛЕСКАЙ ОБЛАСЦ

ЦК ВКП(б) і СНК СССР у сваёй пастанове ад 25 студзеня 1939 года далі разгорнутую праграму работы спажывецкай кааперацыі. У радзе раёнаў Палескай вобласці гэтая пастанова не знайшла належнага ажыццяўлення. Спажывецкая кааперацыя вобласці працаўжае працаваць старымі, даўно асуджанымі, парочнымі метадамі. Асабліва дрэнна працуюць спажывецкія саюзы Глускага, Нараўлянскага, Тураўскага і Парыцкага раёнаў. У гэтым вялікая віна Палескага облспажыўсаюза (старшыня тав. Місючэнка).

Облспажыўсаюз і ўказаныя райспажыўсаюзы штучна стварающь недахват тавараў, марынуюць на складах значныя запасы іх. У многіх сельскіх крамах (Глуск, Катка, Гарадок, Нароўля, Махаеды, Дзёрнавічы, Парычы, Шацілкі, Шчэдрын) адсутнічае ў продажы аконнае і лямпавае шкло, лямпы, туалетнае мыла, вакса, рыжарныя вырабы, гуталін, у той час як на складах гэтых тавараў ёсць у дастатковай колькасці.

У Нараўлянскім раёне зусім сарвана гандаль газай. Па плану на снежань неабходна было атрымаць газы 24 тоны, атрымана-ж толькі 1,8 тоны, а на Мазырскай базе Нафтазбыта ёсць многа газы.

Облспажыўсаюз і райсаюзы зусім слынілі гандаль лесам, цёсам, цэглай і іншымі матэрыяламі для будаўніцтва і рамонту калгасных дамоў.

Зусім не вядзецца барацьба з растратамі, якія з кожным днём узрастаюць. Сістэма облспажыўсаюза, па становішчу на 1 кастрычніка 1939 года, мае 1.896 тысяч рублёў растрат, а дэбіторскай запазычанасці—на суму ў 3.964 тыс. рублёў. К прыкладу, Тураўскі райсаюз на 1 ліпеня 1939 года меў растрат 30.800 рублёў, а на 1 кастрычніка 1939 года— 49.800 руб., Жыткавіцкі—на 1 ліпеня 1939 года—48.500 рублёў, а на 1 кастрычніка 1939 года—64.100 рублёў. Кіраўніцтва облспажыўсаюза ліберальна адносіцца да гэтых злачынных спраў, не прымяняе растратчыкаў да адказнасці, патурае ім.

Злачынныя парушэнні прынцыпаў вецкага культурнага гандлю ўвайшлі у сістэму. У Гарадкоўскім і Клягінскім сельпо, Глускага раёна, схавалі ад 100 метраў баваўняных тканін, а прадалі іх свайкам і знаёмым. Парсельпо (старшыня Гусакоў) самавольна забрала з крам 600 метраў мануфактуры і раздала яе каму хацела. Той-жа Гусакоў разам з загадчыкам гандлёвага аддзела райсаюза Вальфсонам раздалі па сваім ўсцелажанню 23 кілограмы масла, 1 сельдзі.

Кіраўніцтва Парыцкага райсаюза парушае пастанову ўрада аб нормах пуску тавараў у адны рукі. Загадчык магазіна Краўноў шляхам жульніцкіх хінацый выдаў райзагу 30 кілограмаў печанага хлеба для кармлення жывёлы. Такімі-ж метадамі «гандлюе» і загадчык магазіна Цышін, які адпусціў 13 грамаў печанага хлеба таксама для райзага.

У вобласці ёсць многа выпадкаў грубага парушэння палітыкі цэн. Клятнянскае сельпо, Глускага раёна (дырэктар сельп

Пладовыя насаджэнні—на сядзібы калгаснікаў

★

САДЫ УПРЫГОЖВАЮЦЬ СЯДЗІБЫ КАЛГАСНІКАЎ

У 1932 годзе, праз два гады пасля ...ацыі калгаса, мы рашылі абса... калгасную сядзібу пладовымі дрэ... ператварыць яе ў квітнеючы сад. ...ны наступны год рабілася падсад...ў, і цяпер наш сад займае 42 ...ы. Тут растуць яблыні, грушы, ...чарэшні.

...ной, у часе цвіцення, беласнежнымі ...мі ўзнімаюцца ў неба кроны дрэў, ...сень галлё гнецца ад пладоў.

...тры апошнія гады мы з кожнага ...а знімалі па 97 цэнтнераў яблык ...ш.

...пер садовая брыгада рыхтуе дрэвы ...ступнага ўраджайнага лета. Зроблев...вязка дрэў на зіму, вясной правя...абрэзку сухога галля, пабелку, ...кванне і падкладку ўгнаення.

...ы калгасныя садаводы Аляксей ...і Рыгор Шыкун у мінулым годзе ...зілі 20 кустоў вінограду, а сёлета ...хтавалі чаранкі для закладкі віна...ка на плошчы ў 0,25 гектара. ...вырошчваюць клубніку і іншыя ...ы. Сад і ягаднікі з'яўляюцца вялікай ...бнай галіной у калгаснай гаспадар... Ад продажу яблык мы атрымалі за ...год 150 тыс. рублёў прыбытку.

...нас мае пітомнік на 12.000 пладо...саджанцаў. Ужо сёлета палавіна ма... дрэў гатова да пасадкі. Імі мы ...лечым усіх калгаснікаў для пасадкі ...на сваіх сядзібах.

...ьш 30 проц. калгаснікаў нашай ...асарцелі маюць свае сады. Калгас...оных Уладзімір Жураўскі за прала... плады з свайго саду атрымаў паўта...ысячы рублёў. Выкарыстоўваючы ...лены вопыт у калгасе, многія калга...кі вырошчваюць клубніку, агрэст, ...ы і інш.

...я плошча калгаснага саду абсаджана ...й агарожай — тополямі, хвоямі, ...і, грабам. Гэтыя дрэвы абараняюць ...д вятроў.

...калгаснай вуліцы зроблены прысад...пасаджана больш 100 дэкаратыўных ...Сёлета мы будзем пашырань прыпладовымі дрэвамі, бо яны прыно...калгаснікам карысць, упрыгожваюць жыццё.

...станова СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб ...жанні пладовых дрэў на калгасных ...ах накіравана на тое, каб зрабіць ...е калгаснікаў яшчэ больш заможным, больш прыгожым.

Мірон ДЗЕНІСЕНКА,
старшыня калгаса імені Варашылава, Нараўлянскага раёна.

КАНДЫДАТЫ ...А ВЫСТАЎКУ 1940 г.

...радавікі сельскай гаспадаркі Петры...кага раёна падводзяць вынікі сваёй ...най працы ў мінулым годзе і дзейнічуюцца да Усесаюзнай сельскагаспа...ай выстаўкі 1940 года.

...райза паступаюць заявы ад калгасаў ...радавікоў сельскай гаспадаркі аб ...нні іх прыняць удзел у выстаўцы. ...ндыдатам на Усесаюзную сельскагас...рчую выстаўку залічан жывёлавод ...скагаспадарчай арцелі «Пераможца», ...нікага сельсавета, Іван Глушко, які ...працуе трох год поўнасцю захаваў і ...асціў прыплод маладняка. У 1937 ...тав. Глушко ад 45 кароў вырасціў ...цялят, у 1938 годзе ад 47 кароў ...асціў 47 цялят і ў 1939 годзе ад 52 ...ў — 52 цялят.

...олькасць перадавікоў сельскай гас...аркі, жадаючых прыняць удзел ва ...даюнай сельскагаспадарчай выстаўцы, ...лічваецца з кожным днём.

П. КОМАР.

АБ САДАХ І САДАВОДАХ

★ ★ ★

(Думкі і заўвагі)

Выдатны пачын зрабілі большэвікі Маскоўскай вобласці, заклікаўшы калгаснікаў, рабочых і служачых арганізаваць насадку пладовых дрэў на прысядзібных участках. Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені 9 студзеня, Ленінскага раёна, Маскоўскай вобласці, абавязаліся ў 1940 годзе мець на кожным прысядзібным участку 15—20 пладовых дрэў.

На гэты заклік горача адгукнуліся і калгаснікі нашага Дрысенскага раёна. У пахоце за азеляненне прысядзібных участкаў пладовымі дрэвамі ўключыліся таксама настаўнікі. На раённай канферэнцыі яны абавязаліся з першых жа дзён вясны ўзяцца за насадку пладовых дрэў на школьных участках, за азеляненне школ сіламі саміх настаўнікаў і вучняў.

Праз тры месяцы — як толькі сыйдзе снег і растане зямля — разгорнецца работа па насадцы дрэў. Яблыкі, грушы, слівы і вішні будуць садзіць вакол сваіх дамоў не толькі калгаснікі, але рабочыя і служачыя раённага цэнтра. Гэтымі каштоўнымі фруктовымі дрэвамі будуць азеляняцца школы, сельсоветы, бальніцы і іншыя сельскія ўстановы.

У парадку дня стаіць пытанне — дзе ўзяць пасадачны матэрыял? У нашым раёне ў калгасе «Новая культура» ёсць нядрэнны пітомнік пладовых дрэў. Ён ...ласць у год некалькі тысяч прышчэпак яблынь. Сёе-тое з пасадачнага матэрыялу мы дастанем з Полапкага пладовага пітомніка, але гэтага будзе недастаткова. І вось мы паставілі задачу—арганізаваць вясной яшчэ адзін пладовы пітомнік. Такі пітомнік мы можам лёгка арганізаваць у калгасе імені Войкава, Бігосаўскага сельсавета, дзе ёсць сад на плошчы ў 25 гектараў.

Трэба значна пашырыць маленькі пітомнік у калгасе «Новы лад», Прудзінаўскага сельсавета. Трэба падумаць і аб такім мерапрыемстве, як скарыстанне для прышчэпак дзікарастучых маладых яблынь, якіх многа ёсць у нашых лясах.

Сады нашага раёна займаюць плошчу ў 560 гектараў. У 1939 годзе мы павялічылі гэтую плошчу на якіх-небудзь 20 гектараў. Гэтага вельмі мала. У 1940 годзе мы ставім задачу павялічыць плошчу садоў на 125 гектараў.

Маладыя сады ўпрыгожаць і азеляняць 50 новых вёсак, створаных у выніку спынгавання двух тысяч хутарскіх гаспадарак. Многія калгасы Дзёрнавіцкага сельсавета ўжо мінулай восенню азеляніл свае сядзібы пладовымі дрэвамі. Калгаснікі сельгасарцелі «Рухавік» пасадзілі вакол дамоў яблыні. Вішні і яблыні растуць ужо ў новым калгасным цэнтры—сельгасарцелі «Чырвонаармеец». Каля двухсот яблынь пасадзілі вакол сваіх дамоў мінулай восенню і калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Чкалава.

Прыемна ехаць праз калгас «Маяк». Ён увесь утапае ў зелені. Не меншую асалоду даставіць і паездка вясной міма пакрытага белізной кветак калгаснага саду сельскагаспадарчай арцелі «Новая культура». Малады сад гэтага калгаса займае 20 гектараў. Ён толькі пачаў даваць першыя плады, але ўжо ў мінулым годзе калгаснікі выручылі за яблыкі 5.865 рублёў.

У парадку дня — арганізацыя правільнага догляду садоў, барацьба з грызунамі і іншымі шкоднікамі дрэў, абавязальненне і выпрацоўка элементарных правіл пасадкі, догляду і ўгнаення садоў, каб яны давалі штогоднія ўраджаі. У нас ёсць яшчэ вялікія сады, якія ў выніку бездагазных адносін да іх даюць выключна мізэрныя ўраджаі. Недапушчальна, каб сад калгаса імені Войкава, які займае плошчу ў 25 гектараў, даваў столькі-ж прыбытку, колькі дае сад калгаса «Юны мір», Галубаўскага сельсавета, які мае плошчу ў чатыры разы меншую.

Трэба рашуча паставіць пытанне аб кадрах садаводаў. Мы па лініі райземаддзела вызначылі план і праводзім у лютым кароткатэрміновыя курсы на 50 садаводаў-пачаткоўцаў. Дрэнна тое, што ў нас у райза няма чалавека, які-б мог штодзенна даваць практычныя ўказанні і парады шляхам выезду ў калгасы. Стварылася становішча, што ў штаце райземаддзела ёсць вызначаная адзінка садавода, а на гэтым месцы няма пікога.

Пара, нарэшце, падумаць і аб некаторых зменах у азеляненні раённых цэнтраў. Хіба ў нашым горадзе Дрысе на вялікіх плошчах і бульварах нельга пасадзіць некалькі дзесяткаў яблынь і вішань, замест клёна і ліпы?

Яблыня, груша, сліва і вішня, якія да дуць сотні і тысячы цэнтнераў сакавітых фруктаў, павінны заняць пачотнае месца і на прысядзібных участках, і на плошчах не толькі калгасаў, але і раённых цэнтраў.

І. К. САЛАДОЎНІКАЎ,
загадчык Дрысенскага райза.



Калгас імені Сталіна, Кайкаўскага сельсавета, Мінскага раёна, добра падрыхтаваўся да веснавой сяўбы. Сельскагаспадарчы інвентар адрамантаван поўнасцю, участкі заманаваны за звенні. Зараз у калгасе ў другі раз ачышчаюць насенне. НА ЗДЫМКУ (справа): загадчык калгаснай хатай-лабараторыі, ордэнаносец П. С. Бегун правярае якасць ачышчанага насення. Фота Б. Вернера. (Фотахроніка БЕЛТА).

СТВАРЫЦЬ УМОВЫ ДЛЯ РАБОТЫ ЭСТРАДЫ

Самым пашыраным і даходлівым відам мастацтва пасля кіно з'яўляецца эстрада. Гэта—бясспрэчны факт. Няма такога куткa, у які эстрадны актор не мог-бы пранікнуць. У тэатры, клубе, у цэху на заводзе, на калгасным полі, на палубе карабля, на перадавых пазіцыях—усюды эстраднік можа вясёлым жартам, добрай песняй, бадзёрым танцам забаўляць, прапагандыраваць, падняць людзей на новыя поспехі. І чаколькі гэта так, мы павінны патрабаваць ад работнікаў эстрады палітычнай завостранасці і высокай мастацкай якасці выканання.

У канцы 1937 года беларуская эстрада была аб'яднана з філармоніяй, і гэтае мерапрыемства толькі затармазіла яе рост і развіццё. Практыка далейшай работы паказала, што зліянне такіх двух арганізацый нямэтазгодна, і эстраду зноў адазлілі. Зараз беларуская эстрада—самастойная арганізацыя, якая налічвае да 150 акторaў. Гэта—калектыў, з якім можна зрабіць вельмі многае, калі аддаць яму належную ўвагу.

Белдзяржэстрада, не гледзячы на рад тормазаў, правяла вялікую карысную работу. За апошні час па калгасах Беларусі (у Палескай, Магілеўскай, Гомельскай і Мінскай абласцях) арганізавана 240 канцэртаў. Сістэматычна абслугоўваецца периферыя. Акторы эстрады першымі ішлі разам з часцямі нашай доблеснай Чырвонай Арміі, вызваліўшай Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну ад панскага прыгнёту. За час ваенных дзеянняў работнікі эстрады далі да 200 канцэртаў, абслугоўвалі байцоў і грамадзянскае насельніцтва. Амаль усе беспрацоўныя артысты эстрады заходніх абласцей БССР атрымалі работу.

Але ёсць рад сур'ёзных прабелаў у рабоце Белдзяржэстрады. Някай творчай, някай палітыка-выхаваўчай работы з актарамі не праводзіцца.

Упраўленне эстрады туліцца ў пакоі, у якім лезь умяшчаюцца тры сталы. Артыстам няма дзе праводзіць рэпетыцыі: сходы і т. д. Зусім ясна, што ў такой абстаноўцы ніякай творчай работы быць не можа.

Эстрадзе неабходна сур'ёзная дапамога з боку Упраўлення па справах мастацтваў. Перш за ўсё, неабходны мастацкі кіраўнік, які-б узняў мастацкі і ідэйны ўзровень работы. Эстрада павінна мець на першы час хоць якое-небудзь памяшканне.

Пытанне рэпертуара — гэта самае балючае пытанне эстрады. Прыходзіцца карыстацца паслугамі выпадковых аўтараў, якія набілі сабе руку на матэрыяле малых форм, а аўтары вялікіх палотнаў, відавочна, лічаць непадыходзячай для сябе справай займацца эстрадай. Неабходна прыцягнуць Саюз савецкіх пісьменнікаў і беларускіх кампазітараў для стварэння поўнацэннага, высокамастацкага рэпертуара.

Узмоцненая падрыхтоўка да дэкады беларускага мастацтва зусім не закранула эстраду. Хіба гэта нармальна? Чаму эстрада ў баку? Мы лічым, што прадстаячая дэкада павінна з'явіцца стымулам для падняцця работы ва ўсіх творчых адзінках БССР.

І, нарэшце, мы лічым, што Беларусь павінна мець свой рэспубліканскі Тэатр эстрады і мініятюр, які быў-бы цэнтрам усёй работы эстрады па клубах і периферыі.

Жаданне актораў эстрады мець свой тэатр зусім законна і своечасова. Для работы ў такі тэатр могуць быць прыцягнуты, па сумяшчэнню, рэжысёры і артысты іншых тэатраў.

Апрача таго стварэнне такога тэатра дасць поўную магчымасць шырока азнаёміць гледачоў з лепшымі праграмамі і вядучымі артыстамі эстрады Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў брацкіх рэспублік.

Заслужаны артыст рэспублікі І. М. БАЛОШІН Артысты эстрады: А. С. АСТАХАЎ, М. С. КАРАГАШЫНСКАЯ, Л. Г. АДАМАНТАВА, Р. Н. НОВІК.

Змяняецца жыццё

З кожным днём працоўныя заходніх абласцей БССР усё больш адчуваюць вялікія клопаты аб сабе совецкай улады. Расшыраюцца прадпрыемствы, пускаюцца ў ход заводы, закансервіраваныя пры ўладзе польскіх паноў. Паляпшаюцца культурна-бытавыя ўмовы рабочых, сялян, інтэлігенцыі. Ліквідуецца вечны спадарожнік капіталізма—беспрацоўе. Мяняюць сваё аблічча гарады, мястэчкі, вёскі.

Горад Пінск і яго паветы ў мінулым мала чым адрозніваліся ад іншых гарадоў і паветаў Польшчы. Польскія магнаты штучна затрымлівалі гаспадарчае развіццё Заходняй Беларусі, па-варварску, драпежніцка выкарыстоўвалі прыродныя багацці, не ўдзялялі ўвагі развіццю прамысловасці і паляпшэнню добрабыту працоўных.

Пінская вобласць з'яўляецца цэнтрам лясных багацняў Заходняй Беларусі, а між тым дрэваапрацоўчая прамысловасць у Пінску і павеце была развіта вельмі слаба. Існаваўшая ў Пінску запалкавая фабрыка з 250 рабочымі працавала 4 дні ў тыдзень. Рабочыя неймаверна эксплаатаваліся, працавалі па 10—11 гадзін пры нізкай аплаце працы.

Зусім іншае становішча назіраем мы зараз на фабрыцы. Яна працуе ў тры змены. На прадпрыемстве занята 950 рабочых, з іх 700 чалавек уноў атрымалі работу.

Вялікую ўвагу ўдзяляе фабком і дырэкцыя фабрыкі бытавым і культурным запатрабаванням рабочых. Пры фабрыцы адкрыты яслі на 80 дзяцей, абсталяван чырвоны куток. Рабочым выданы бясплатна дровы, некаторыя рабочыя атрымалі добра абсталяваныя кватэры. Працуе школа па ліквідацыі непісьменнасці.

У плане 1940 года дырэкцыя фабрыкі намеціла набудову клуба на 500 месц, дзіцячага саду, новай сталовай.

Вялікую работу па вылучэнню і выхаванню новых кадраў разгарнула на фабрыцы партыйная арганізацыя. Агітатары Рухман, Валейка, Клубовец і рад іншых штодзенна праводзяць сярод рабочых гутаркі, чыткі газет.

60 маладых рабочых і работніц фабрыкі вывучаюць праграму і статут камсамола, рыхтуюцца да ўступлення ў рады ВЛКСМ.

За апошні час на кіруючую гаспадарчую работу вылучана многа здольных, праявіўшых сябе рабочых і работніц. Так, рабочы Генэр А. вылучан на пасаду начальніка збыту і снабжэння, работніца Гімлер Бася працуе начальнікам адзела кадраў. Майстрамі цэхаў вылучаны 9 рабочых і работніц.

Значную дапамогу партыйнай і прафесіянальнай арганізацыям фабрыкі ў будаўніцтве новага жыцця аказвае насценная газета. Яна з першых-жа дзён павяла барацьбу за паднясце прадукцыйнасці працы, змагаецца з прагуламі, парушальнікамі ўгоры сталханаўскай працы перадавых рабочых.

Больш года не працаваў фанерны завод у Гарадзішчы. 25 верасня завод пушчан у ход і працуе на дзве змены. На прадпрыемстве занята 380 рабочых. За два з палавінай месяцы завод выпусціў больш 500 кубаметраў добраякаснай фанеры. Калектыў завода няўтомна клапоціцца аб снабжэнні яго сыравінай. Так, з возера, якое знаходзіцца недалёка ад завода, рабочыя па сваёй ініцыятыве выцягнулі дрэва—сыравіну, якая некалькі год ляжала на дне. Зараз прадпрыемства мае запасы сыравіны на 3 месяцы.

Хутка завод пяройдзе на трохзменную работу. На ім будуць працаваць больш 600 чалавек. Будуюцца жылыя дамы, клуб, дзіцячыя яслі, сал. сталовая.

Вялікую ўвагу ўдзяляе часовае ўпраўленне горада арганізацыі саматужнікаў-адзіночак у арцелі. Ужо арганізавана швейная арцель «Новы шлях», якая ...ае больш 50 саматужнікаў. Арцель «Новы шлях» шые мужчынскія і жаночыя плашчы, коўдры, мае шапачны, белашвейны і іншыя цэхі.

На плану 1940 года намячаецца ў розных пунктах горала Пінска арганізаваць «амерыканкі», якія будуць рабіць дробны рамонт абутку, плацця, уцюжку бялюю і т. д. Арганізацыя «амерыканак» ...ласць магчымасць прадставіць работу больш 100 беспрацоўным саматужнікам.

Часовае ўпраўленне вялікую ўвагу ўдзяляе паляпшэнню быту рабочых. Камунальны аддзел прадставіў 501 кватэру рабочым, якія раней жылі ў падвалах. Заканчваецца будаўніцтва 4-павярховага і 2-павярховага дамоў. Пабудавана водаправодная вежа. Заблукавана 12 вуліц. Заканчваецца будаўніцтва ветэрынарнай лячэбніцы, нанава пераабсталяван гарадскі тэатр.

У 1940 годзе намечана пабудаваць новы тэатр на тысячу месц, 3 жылыя дамы на 60 кватэр кожны, лазню, прачэчную, вадаправод і ачысціцяві рад іншых мерапрыемстваў, якія значна паляпшаюць быт працоўных горала Пінска.

Зараз у цэнтры ўвагі працоўных Пінскай вобласці знаходзіцца будаўніцтва Дняпра-Бугскага воднага шляху, які павінен быць адкрыт 15 красавіка 1940 года.

Дняпра-Бугскі водны шлях яшчэ вышэй падніме эканоміку вобласці.

Будаўніцтва Дняпра-Бугскага воднага шляху з'яўляецца грандыёзным мерапрыемствам. На ім будзе занята да 8 тысяч рабочых.

У будаўніцтве Дняпра-Бугскага воднага шляху прымаюць удзел усе нашы заводы і фабрыкі. Яны дапамагаюць рабочай сілай, матэрыяламі. Так, напрыклад, дырэктар торфзавода тав. Кутнюк прадставіў у распараджэнне начальніка будаўніцтва неабходнае абсталяванне. Дырэктар лесазавода тав. Верхавец адпусціў лесаматэрыялы, патрэбныя для арганізацыі работ.

Вялікую дапамогу ў будаўніцтве Дняпра-Бугскага воднага шляху аказвае і сялянства: яно прадстаўляе коней, рабочую сілу і т. д.

Бурнай крыніцай б'е новае жыццё працоўных Пінскай вобласці.

П. ПІНСКІ.

Жыццё Чырвонай Арміі

У ЛЮБЫ ЧАС ГАТОВЫ ГРАМІЦЬ ВОРАГА

БАВА. **(Па тэлефону).** У абстаноўцы дзелавой крытыкі і самакрытыкі прайшла комсамольская канферэнцыя Н-скага злучэння.

Вялікае месца ў сваіх выступленнях дэлегаты тт. Марчанка, Драпкін і іншыя ўдзялілі праробленай комсамольскай арганізацыяй рабоце ў перыяд баявых дзеянняў па вызваленню працоўных Заходняй Беларусі ад іга польскіх паноў.

— Наша комсамольская арганізацыя, —гаворыць тав. Марчанка, — з пастаўленай у перыяд баявых дзеянняў задачай справілася паспяхова. Комсамольцы заўсёды былі ў авангардзе. Нашаму падраздзяленню была пастаўлена баявая задача: да канца наступнага дня навесці мост праз раку Н. Члены ВЛКСМ узначалілі выкананне гэтай баявой задачы, і мост быў наведзен да 10 гадзін раніцы. Узор выдатных дзеянняў паказаў комсамолец шофер тав. Грышын. Яго машына не мела ні адной вымушанай астаноўкі і заўсёды была ў баявой гатоўнасці. За час службы ў радах Чырвонай Арміі ён мае 28 заахвочванняў.

У цэнтры ўвагі ўсіх выступаўшых дэлегатаў было пытанне аб вядучай ролі комсамола ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы. Узорам гэтага з'яўляецца комсамольская арганізацыя, дзе сакратаром бюро тав. Хлусаў. На аснове шырока разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва імені Трацкай Сталінскай Пяцігодкі арганізацыя дабілася добрых вынікаў у вучобе і заняла другое месца ў акрузе.

Дэлегаты гаварылі аб недастатковай дапамозе комсамольскіх арганізацый таварышам, якія самастойна вывучаюць гісторыю ВКП(б). Мала праводзіцца тэарэтычных канферэнцый, лекцый, кансультацый.

Пад доўга незмаўкаючыя апладысменты дэлегаты аднадушна прынялі прывітальныя тэлеграмы правадыру працоўных рэлікаму Сталіну, Народнаму камісару абароны першаму Маршалу Совецкага Саюза таварышу Варашылаву і главе совецкага ўрада таварышу Молатаву. Паслана таксама прывітанне байцам, камандзірам і палітработнікам Ленінградскай Ваеннай Акругі, якія змагаюцца за вызваленне фінляндскага народа ад белафінскіх банд.

У адпаведнасці прынятай рэзалюцыі дэлегаты запэўнілі камандаванне, што комсамольцы злучэння ўпорнай работай яшчэ больш павысяць якасць баявой і палітычнай падрыхтоўкі і гатовы ў любы час граміць ворага, адкуль-бы ён ні паявіўся.

Н. САПРЫКІН.

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ МАЛАДЫХ БАЙЦОЎ

БАВА. **(Па тэлефону).** Маладыя байцы Н-скай часці рыхтуюцца дастойна сустрэць знамянальную падзею ў іх жыцці—дзень прыняцця ваеннай прысягі. У заключаных сацыялістычных дагаворах яны абавязваюцца мець у баявой і палітычнай падрыхтоўцы толькі выдатныя адзнакі. Дасканала вывучыць матэрыяльную частку баявой зброі. Узятыя абавязацельствы з гонарам выконваюцца.

Адзіняенні, якімі камандуюць тт. Кудзюкін, Чэркалаў, на праву лічацца перадавымі. Гэты поспех дасягнут дзякуючы іх штодзеннай рабоце з байцамі, рэгулярнай праверцы выканання сацыялістычных абавязацельстваў. На нядаўна праведзеным вучэбнай стральбе гэтыя адзіняенні паказалі добрыя вынікі.

Стралкі тт. Расчукін, Агафаў, Вялюга, Казарцоў і іншыя добра вывучылі матэрыяльную частку баявой зброі і практычнае яе прымяненне ў баі. У агнявой падрыхтоўцы яны маюць адзнаку «выдатна».

Маладыя чырвонаармейцы актыўна ўдзельнічаюць у масавай рабоце. Тт. Гнутаў і Хамцоў зарэкамендавалі сябе добрымі бяседчыкамі. Яны ў вольны час масавай работы рэгулярна праводзяць чытку матэрыялаў з газет і гутаркі на розныя тэмы. Баец т. Вінаградаў прымае актыўны ўдзел у арганізацыі чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці.

Да дня ўсенароднага свята—XXII гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота—байцы і камандзіры ставяць перад сабой задачу дабіцца права на ўзнагароджанне іх нагрудным знакам «Выдатнік РСЧА».

РЫХТУЮЦЦА ДА XXII ГАДАВІНЫ РСЧА

Цэнтральнае месца ў падрыхтоўцы да слаўнай гадавіны Чырвонай Арміі ў Н-скай часці займае барацьба за права атрымання значка «Выдатнік РСЧА». Нядаўна кулямётчыкі падраздзялення, якім камандуе тав. Арлоўскі выконвалі агнявую задачу. Не гледзячы на мароз і завею, стральба з баявой зброі была выканана выдатна. Узоры меткай стральбы паказалі кулямётчыкі тт. Рыбакоў, Токараў, Гарбуноў, Леснічэнка і іншыя.

У падраздзяленні, якім камандуе тав. Меладзе, былі праведзены тактычныя заняткі на тэму «Бліжні бой». Курсанты тт. Горбікаў і Сотнікаў выконвалі абавязкі малодшых камандзіраў. Яны чотка падавалі каманды, хутка маскіраваліся. Заняткі прайшлі арганізавана і прынеслі вялікую карысць байцам і камандзірам.

(БЕЛТА).

СЕВААБАРОТ І БАРАЦЬБА ЗА СТО ПУДОЎ ЗЕРНАВЫХ

(Вопыт работы аграномаў Бабруйскага раёна)

...партыя і ўрад пытанню ўвядзен... правільных севаабаротаў аддаюць ...кую ўвагу. У рашэннях XVIII ...тыйнага з'езда запісана: «Уняць у калгасах і соўгасах пра...ныя севаабароты з прымяненнем траення і чорных папараў, якія за...печвалі значнае павелічэнне плаадаро...ці глеб, рост ураджайнасці і стварэнне ...най кармавой базы для растучай жы...гадоўлі».

Адразу-ж пасля XVIII з'езда партыі ў ... была праведзена нарада спецыялістаў ...ьскай гаспадаркі з удзелам партыйных ...овецкіх работнікаў. Выхадзячы з ра...ненняў партыі і ўрада, мы на нарадзе ...бакова распрацавалі каленіарны план ...ізення севаабаротаў. Былі створаны ...пыяльныя групы з аграномаў, земле...арадчыкаў і зоатэхнікаў. Тутэйша на на...зе спецыялісты выклікалі адзін аднаго на сацыялістычнае спаборніцтва.

У гэты-ж дзень удзельнікі нарады раз'ехаліся па месцах. Спачатку праводзілі ...ульныя сходы калгаснікаў. Аграномы і ...леўпарадчыкі рабілі даклады аб важ...сці севаабаротаў ва ўсёй сістэме аграгічных мерапрыемстваў, расказвалі аб ...зных тыпах севаабаротаў, з такім разлі...м, каб калгаснікі змаглі ўжо на гэтым ...зе падабраць тып севаабароту, які-б ...йбольш адпавядаў глебавым і гаспадар-эканамічным умовам гаспадаркі.

Пры выбары тыпу севаабароту калгас...кі і спецыялісты кіраваліся адным ...ноўным палажэннем: ён павінен забяс...чыць выкананне дзяржаўнага планавага ...дання і на плошчы пасеву культур, і па ...алажайнасці. Пры гэтым улічваліся вывад ...шматгадовай практыкі, якія сцвярджалі ...то севаабарот тады, усякую сяю ...штоўнасць, калі ён не забяспечвае атры...ання прагрэсіўна-ўстойлівых ураджаяў, ...гварэння моцнай кармавой базы для кал...енай жывёлагадоўлі, калі ён не стварае ...айленных умоў для асноўных культур ...рнавых, ільну і бульбы, не дае магчы...асці правільна арганізаваць працу.

Нямала ўвагі мы аддавалі вызначэнню колькасці севаабаротаў у кожным калгасе.

У нашым раёне ёсць такія калгасы, дзе ўвядзенне аднаго севаабароту роўназначна яго адсутнасці. Напрыклад, у калгасе імені Вароўскага поле падзелена палоскай лесу на дзве часткі. Адна частка поля з населеным пунктам Барбарава характэрна больш звязнымі глебамі, а другая частка з населенымі пунктамі Будзёнаўка і Тапаркі мае больш лёгкія глебы. Населены пункт Барбарава знаходзіцца ад іншых населеных пунктаў на адлегласці 4 км. Апрача таго, землекарыстанне калгаса распягнута на 9 кіламетраў. Усё гэта гаварыла за тое, што ў калгасе імені Вароўскага неабходна было ўвесці два севаабароты: на больш звязных глебах — васьміпольны, а на лёгкіх — сяміпольны.

Або возьмем для прыкладу размяшчэнне зямель калгаса імені Куйбышэва. Яго ворыўная плошча знаходзіцца ў трох масівах на значнай адлегласці адзін ад аднаго. Глебы гэтага калгаса таксама неаднародныя: на адным участку пераважае пясок, на другім — лёгкія суглінкі, а на трэцім — звязныя супясі. Улічыўшы ўсе гэтыя акалічнасці, неабходна ўвесці ў калгасе імені Куйбышэва тры севаабароты.

Калгаснікі жыва цікавіліся рознымі пытаннямі агранамічнага і арганізацыйнага характару. Яны самі распрацоўвалі план севаабароту разам са спецыялістамі сельскай гаспадаркі, стваралі найлепшыя ўмовы для работы землеўпарадчыкаў і аграномаў.

Кожны землеўпарадчык у нас выкарыстоўваўся максімальна. Тэхнічная нарада райза для таго, каб не адрываць спецыялістаў ад работы, праводзіла разгляд праектаў севаабаротаў на месцы, у калгасах. Пасля гэтага праекты сцвярджаліся на агульных сходах. Прынятыя агульнымі сходамі севаабароты зацвярджаліся прэзідыумам райвыканкома непасрэдна ў сельсоветах. Толькі пасля гэтага палі севаабароту выносіліся ў натуру, а аграном ехаў у другі сельсавет дапамагаць там землеўпарадчыку.

За два гады работы намі ўведзены севаабароты ў 122 калгасах нашага раёна, з іх у 43 калгасах — васьміпольныя, у 48 — сяміпольныя, у 10 — пяціпольныя, у 20 — чатырохпольныя і ў адным калгасе—дзевяціпольны. Апрача гэтага ўведзена лугапасбітычных васьміпольных севаабаротаў 24 і шасціпольных — два, на асушаных тарфянніках — 13. У калгасах, якія маюць не менш 4—5 гектараў агароду і значныя плошчы маладога саду, уведзены спецыяльныя севаабароты.

За праведзеную работу па ўвядзенню севаабаротаў Наркамзем БССР прэміраваў загадчыка райза т. Ланіцкага, аграномаў тт. Чубрыка, Чабатарэўскага, землеўпарадчыкаў тт. Гаеўскага, Лося і іншых.

Пераважная большасць аграномаў падышла да сваёй работы. Яны не толькі працавалі разам з землеўпарадчыкамі, але павышалі агранамічныя веды калгаснікаў. Не дзіва, што ў многіх калгасах (імені Сталіна, імені Красіна і інш.) усе — ад старога да малога — ведаюць месцазнаходжанне палёў, чарганне культур і агратэхніку кожнага поля.

Асабліва характэрным у гэтых адносінах з'яўляецца вопыт калгаса імені Сталіна. Пасля падрабязнага абмеркавання калгаснікі гэтай сельгасарцелі рашылі ўвесці севаабарот з наступным чарганнем культур:

1. Папар чорны і лубінавы.
2. Азімыя (жыта і пшаніца).
3. Яравыя і зернавыя (ячмень і пшаніца) з пасевам шматгадовых траў.
4. Прапашныя.
5. Шматгадовыя травы першага года карыстання.
6. Шматгадовыя травы другога года карыстання і лён.
7. Азімыя.
8. Яравыя зернавыя (авёс і грэчка).

Дэтальна была распрапавана сістэма працоўкі і ўгнаення кожнага поля.

На папаравым полі пасля зняцця папярэдніка праводзіцца лушчанне на глыбіню 4—5 сантыметраў, а пасля—зяблевае ворыва плугам з прадплужнікам на глыбіню 18—22 сант.

Ранняй вясной намечана баранаванне, па меры з'яўлення пустаселля — трохразовая культывацыя, а за 20 дзён да пасеву — прадпасеўнае ворыва з унясеннем 20 тон гною і 30 тон торфу.

Пятае і шостае поле, як відаць з прыведзенай таблічкі, заняты шматгадовымі травамі першага і другога года карыстання. Летам, пасля зняцця першага ўкосу, запланіравана баранаванне і ўнясенне на гектар 3 цнт. суперфасфату і 1,5 цнт. калійнай солі.

Прымяненне комплекса агратэхнічных мерапрыемстваў дало магчымасць ужо ў 1939 годзе ў калгасе імені Сталіна атрымаць з кожнага гектара зернавых на 3 цнт. больш, чым у 1938 годзе.

Сярэдні ўраджай зернавых з усёй плошчы склаў 11,6 цнт. з гектара.

У 1940 г. калгаснікі рашылі сабраць з кожнага гектара ў сярэднім 100 пудоў зернавых і 1000 пудоў бульбы. Гэтаму будзе садзейнічаць пераход калгаса да разгорнутага севаабароту.

Усё гэта гаворыць аб тым, што севаабарот у калгасе з'явіўся асноўным рычагом павышэння ўраджайнасці.

Яшчэ больш узрасце аўтарытэт севаабароту ў сувязі з новай пастановай партыі і ўрада аб парадку планавання пасеваў зернавых культур у калгасах. Гэта пастанова дасць магчымасць больш правільна размясціць культуры ў севаабароце, завяваць новыя перамогі ў павышэнні ўраджайнасці сацыялістычных палёў.

Задача аграномаў цяпер заключаецца ў тым, каб накіраваць творчую ініцыятыву калгаснікаў і дапамагчы ім асвоіць уведзеныя севаабароты і, прымяніўшы ўвесь комплекс агратэхнічных мерапрыемстваў, дабіцца 100-пудовага ўраджаю зернавых і высокіх ураджаяў усіх астатніх культур.

І. Ф. ШАЦІЛА,
старшы аграном Бабруйскага райза.

ЗА РУБЯЖОМ



«Нейтральная» палітыка Скандынаўскіх краін. Рыс. Л. Берковіча.

РУХ У АНГЛІІ ЗА МІР

ЛОНДАН, 15 студзеня. (ТАСС). Лейбарысцкая арганізацыя Усходняга Ісліngтона (паўночная частка Лондана) аднагалосна прыняла рэзалюцыю, заклікаючую лейбарысцкія і прафсаюзныя арганізацыі арганізаваць шырокую кампанію супроць ўцягвання зброі ў Фінляндыю. У рэзалюцыі падкрэсліваецца, што цяперашняя вайна з'яўляецца імперыялістычнай вайной.

Нацыянальны совет лейбарысцкай партыі выключыў з свайго састава лейбарысцкую арганізацыю Хэмістыда (паўночная частка Лондана) за тое, што яна прыняла рэзалюцыю, асуджаючую цяперашнюю вайну.

***

ЛОНДАН, 16 студзеня. (ТАСС). Газета «Дэйлі уоркер» паведамляе, што лейбарыст Грыфін, які намячаўся кандыдатам у парламент ад адной з выбарчых акруг Бірмінгама, зняў сваю кандыдатуру і заявіў аб намеры ўступіць у рады кампартыі. Сваё рашэнне Грыфін матывуе тым, што ён не згодзен з кіраўніцтвам лейбарысцкай партыі, якое падтрымлівае ўрад і яго палітыку вайны.

Адказ англійскага ўрада на ноту амерыканскіх краін

ЛОНДАН, 16 студзеня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе па радыё, што англійскі ўрад адхіліў ноту, уручаную яму 23 снежня ўрадам Панамы ад імені 21 амерыканскай рэспублікі, у якой заяўлялася, што аперацыі англійскіх ваенных караблёў супроць германскага лінкора «Адмірал граф Шпее» з'явіліся парушэннем пан-амерыканскай дэкларацыі аб устанаўленні 300-мільнай зоны бяспекі для амерыканскага ўзбярэжжа.

У сваім адказе англійскі ўрад заяўляе, што без прыняцця належных мер зона бяспекі можа ператварыцца ў прытулак для германскіх ваенных караблёў, а таксама германскіх суднаў, якія снабжаюць ваенныя караблі. У сувязі з гэтым англійскі ўрад пакідае за сабой усе правы ваюючай краны ў гэтай зоне да таго часу, пакуль не будзе знішчана небяспека выкарыстання гэтай зоны германскімі караблямі, якія імкнуцца уніknуць сустрэчы з ваеннымі суднамі саюзнікаў.

Водгукі англійскага друку на прамову Саймона

ЛОНДАН, 15 студзеня. (ТАСС). Англійскі друк шырока каментыруе прамову міністра фінансаў Саймона ў Глазго. Блізкія да ўрада газеты асабліва адабраюць заяву Саймона аб тым, што нельга весці вайну без цяжкіх афяр з боку насельніцтва.— Калі насельніцтва не зменшыць спажыванне,—піша «Абсервер»,—цэны на тавары ў бліжэйшы час узрастуць больш чым на 50 адсоткаў. Гэта можа прывесці да рэзкага павелічэння беспрацоўя і да катастрафічнага крызісу. Саймон указаў, што і бюджэт і картачная сістэма маюць сваёй мэтай зніжэнне спажывання тавараў насельніцтвам.

Ваенныя мерапрыемствы бельгійскага ўрада

БЕРЛІН, 15 студзеня. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што па рашэнню бельгійскага ўрада ў краіне праводзіцца рад ваенных мерапрыемстваў. Гэта асабліва адносіцца да ўсходніх пагранічных раёнаў Бельгіі, дзе ажыццяўляюцца вялікія абаронныя работы. Эвакуацыя раёнаў, размешчаных у непасрэднай блізасці да граніцы, а таксама тых вёсак, якія размешчаны на адлегласці гарматнага выстрала ад крэпасці Льеж, у асноўным закончана. Апрача таго ва ўнутр краіны пераведзена абсталяванне ўсіх важнейшых прамысловых прадпрыемстваў, размешчаных у мніма небяспечнай зоне. На ўсіх вакзалах з учарашняга дня праводзіцца запямненне. Паязды курсіруюць таксама не з поўным асвятленнем. Будынкі ўсіх міністэрстваў і ў асаблівасці міністэрства замежных спраў і розныя грамадскія будынкі ахоўваюцца войскамі.

Японскі імператар адобрыў састаў новага кабінета

ТОКІО, 16 студзеня. (ТАСС). Агенцтва Домей Цусін перадае па радыё, што сёння японскі імператар адобрыў састаў новага кабінета, прадстаўлены яму прэм'ерам—адміралам Іонай.

На пост міністра ўнутраных спраў назначан Кодама Хідэо (член верхняй палаты, былы міністр калоній у 1934—36 гг. і міністр сувязі ў 1937 г.).

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ПАЎДНЁВЫМ КІТАІ

У паўночнай частцы правінцыі Гуандун кітайскія войскі прадаўжаюць праследаваць адыходзячыя японскія часці. Адна з перадавых кітайскіх калон наступае на японскія пазіцыі, размешчаныя ў 20 км на паўночны захад ад Кантона. У раёне Сіньцзеюй (на поўнач ад Кантона) японскія войскі пасля жорсткага бою пакінулі свае пазіцыі. У баях у гэтым раёне японцы страцілі больш 500 чалавек забітымі. Кітайскія войскі захапілі вялікую колькасць зброі і амуніцыі, уключаючы 4 палявых гарматы і 9 станкавых кулямётаў.

Маленькі фельетон

АФЯРЫ і ПРЫБЫТАК

Духоўныя асобы ўсіх масцей і рангаў лічаць самым выгадным таварам у сваім прэйскуранце па ашуканству мас абяцанні райскага жыцця на нябёсах, так сказаць, у загробным свеце. Яны гавораць:

— Цярпіце, прававерныя, на гэтай грэшнай зямлі і вы заслужыце міласць боскую і рай на нябёсах.

Не будзем гаварыць аб тым, што пакупнікоў гэтага гнілога тавару становіцца ўсё менш. І нават папа Пій XII вымушан быў прызнаць, што справы нябесныя вельмі пахіснуліся.

Але пакінем пакуль-што ў баку нябеснае жыццё. Спусцімся на грэшную зямлю і паглядзім, як тут абстаяць справы.

Саймон, міністр фінансаў Англіі, гэтымі днямі выступіў у Глазго з прамовай. Ён гаварыў аб вайне, якую Англія і Францыя вядуць супроць Германіі, і аб афярах, якія насельніцтва павінна прынесці ў імя гэтай вайны.

Не ведаем, які выраз твару быў у міністра: ангельскі, боскі ці банкірскі. Але ён сказаў:

— Насельніцтву неабходна зразумець, што прыдзецца згадзіцца на больш нізкі ўзровень жыцця. Патрэбны цяжкія афяры ў імя вайны.

Калі перакласці сказанае на агульначалавечую мову, то гэта азначае:

— Цярпіце, англічане і англічанкі, на гэтай грэшнай зямлі. Пацягвайце тужэй жываты. Спакойна выслухоўвайце плач вашых галодных дзяцей. Замест хлеба карміце іх паведамленнямі аб будучых перамогах на фронце. І зразумейце—так патрэбна!

Ах каго патрабуюцца афяры і хто павінен «згадзіцца на больш нізкі ўзровень жыцця» — гэта зразумела: працоўныя. Вайна нясе ім разарэнне, нішчату, голад. І яны ўжо гэта адчулі. Беспрацоўе павялічваецца. Армія галодных расце.

Блізка стаячая да ўрада газета «Дэйлі тэлеграф энд Морнінг пост» вымушана гэта прызнаць. Яна паведамляе, што ў будаўнічай прамысловасці колькасць беспрацоўных павялічылася ў снежні ў параўнанні з лістападам на 11.556 чалавек. А павелічэнне беспрацоўя ў гэтай галіне прамысловасці пацягнула за сабой рост беспрацоўя і ў іншых галінах.

А вось ад каго афяры не патрабуюцца і каму вайна прыносіць больш высокі ўзровень жыцця — гэтага англійскі міністр не сказаў. Ён, па зусім зразумелай прычыне, не сказаў, што вайна нясе вялікія прыбыткі гаспадарам англійскага Сіці — банкірам, капіталістам, фабрыкантам; што ім, і толькі ім, выгодна гэта вайна; што ім, і толькі ім, патрэбна яна для грабежніцкіх імперыялістычных мэт.

Ды дзе там англійскаму міністру гаварыць аб такіх прозаічных справах! Нельга раскрываць карты! Небяспечна!

Вось і атрымліваецца:

Афяры павінны несці тыя, хто не атрымлівае ніякай выгады ад вайны.

А выгаду і прыбытак ад вайны атрымліваюць тыя, хто не прыносіць ніякіх афяр.

Вось што значыць капіталістычны «падзел працы».

С. КУНЯЎСКІ.

АСУШКА 50 ТЫСЯЧ ГЕКТАРАЎ БАЛОТ

Урад БССР зацвердзіў план асваення новых зямель, палепшання лугоў і пасбішчаў сіламі калгасаў. Пашырэнне плошчы ворыва і культурных лугоў будзе праводзіцца шляхам асушкі балот. У гэтым годзе калгасы рэспублікі асушаць больш 50 тысяч гектараў забалочаных зямель і асвояць 45 тысяч гектараў балот меліяраваных у мінулыя гады. Будуць закладзены культурныя лугі на плошчы ў 8 тысяч гектараў.

Для дапамогі калгасам у рэгуляванні рэк і пракладцы каналаў у бягучым годзе выдзелена па дзяржаўнаму бюджэту каля 3 мільёнаў рублёў. Апрача таго, намячаецца выдаць калгасам доўгатэрміновы крэдыт у суме да 2 мільёнаў рублёў.

15 студзеня пачалася прыпіска да прызыўных участкаў грамадзян нараджэння 1921 года і ўсіх вучняў сярэдніх школ і тэхнікумаў, якія нарадзіліся ў 1922 годзе. НА ЗДЫМКУ: дапрызыўнік-слесар мінскай шалернай фабрыкі імені Варашылава В. Ф. Брайко атрымлівае прыпісную кніжку. Фота І. Казловіча.

ПАЧАЛАСЯ ПРЫПІСКА ДАПРЫЗЫЎНІКАЎ

Учора ў Мінску пачалася прыпіска да прызыўных участкаў грамадзян нараджэння 1921 года і ўсіх навучаючыхся ў сярэдніх школах і тэхнікумах, нарадзіўшыхся ў 1922 годзе.

З раніцы прыпісныя пункты запоўніліся вясёлай, жыццярадаснай моладдзю. Прыпісны пункт Кагановіцкага раёна, які знаходзіцца ў клубе імені Сталіна, упрыгожан лозунгамі і плакатамі. Дапрызыўнікі ўважліва разглядаюць фотавыстаўку, прысвечаную жыццю і рэвалюцыйнай дзейнасці Уладзіміра Ільіча Леніна.

Да пачатку работы камісіі ваенком — маёр, ордэнаносец тав. Жлуткоў правёў гутарку аб міжнародным становішчы і задачах падрыхтоўкі да прызыва ў Чырвоную Армію.

Нарэшце, наступіла доўгачаканая мінута. Камісія прыступіла да работы. Да рэгістратараў адзін за адным падыходзяць будучыя байцы Чырвонай Арміі. Запаўняюцца прызыўныя карткі і прыпісныя пасведчанні. Вось падыходзіць да стала рэгістратуры дапрызыўнік, студэнт Політэхнічнага інстытута, комсамолец тав. Баравік. Ён дае аб сабе патрэбныя весткі. Адказваючы на запытанні аб ваеннай падрыхтоўцы, ён паказвае свае грудзі, упрыгожаныя значкамі «Варашылаўскі стралок», «Гатоў да ПВХА» і «Гатоў да санітарнай абароны». Такая ваенная падрыхтоўка не толькі ў тав. Баравіка. Пераважная большасць дапрызыўнікаў ужо здала нормы на 2—3 абаронных значкі, мае сярэднюю асвету.

Прайшоўшы праз кабінет па вызначэнню групы крыві і медыцынскую камісію, будучыя воіны нашай слаўнай Чырвонай Арміі падыходзяць да прызыўной камісіі. Хвалюючыя мінуты. Кожны гарыць жаданнем найхутчэй пачуць слова, якое радуе кожнага савецкага патрыёта.

— Годзен! — громка гучыць з вуснаў ваеннага камісара, і тут-жа ён паведамляе аб вызначэнні кожнага дапрызыўніка ў той або іншы род войск. Многія дапрызыўнікі падаюць заявы аб датэрміновай пасылцы іх у ваенна-тэхнічныя вучылішчы. Яны жадаюць усё сваё жыццё прысвяціць службе ў радах любімай арміі краіны перамогшага сацыялізма.

Першы дзень прыпіскі ў Мінску прайшоў арганізавана. Ён паказаў, што Чырвоная Армія сёлета атрымае выключна фізічна здаровае, пісьменнае, у ваенных адносінах абучанае папаўненне.

Л. ГОРФІНКЕЛЬ.

РАДЫЁФІКАЦЫЯ І ТЭЛЕФАНІЗАЦЫЯ ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ БССР

У заходніх абласцях БССР у бягучым годзе шырока разгорнуцца работы па радыёфікацыі і тэлефанізацыі гаралоў і вёсак. На гэтую мэту выдзелена 13.200 тысяч рублёў.

У абласных і найбольш буйных раённых цэнтрах абсталёўваюцца 30 трансляцыйных радыёвузлоў. Гэта дасць магчымасць на працягу бліжэйшых пяці гадоў радыёфікаваць 50 тысяч кватэр працоўных гаралоў і вёсак. Будуць пабудаваны трансляцыйныя лініі працягам у 760 кілометраў.

Вялікае развіццё атрымае гарадская і ўнутрыраённая тэлефонная сувязь. Расшыраюцца 32 гарадскія тэлефонныя станцыі. Магутнасць кожнай з іх павялічваецца з 10—20 нумароў да 100 і больш нумароў. У горадзе Пружаны, Брэсцкай вобласці, ёмкасць мясцовай станцыі павялічваецца з 90 да 200 нумароў, у мястэчках Іоды, Вілейскай вобласці і Кольна, Беластоцкай вобласці — з 10 да 100 нумароў кожная і т. д. Для тэлефанізацыі сельскіх мясцовасцей будуць пабудаваны 4.210 кілометраў ліній і падвешана прававоду прыпаям у 12.530 кілометраў.

Значная ўвага ўдзяляецца пашырэнню і расшырэнню міжгародняй тэлефоннай сувязі. У Вілейцы — абласным цэнтры — пабудавана і ўпершыню ў ход новая міжгародняя тэлефонная станцыя. Ужо ў гэтым годзе кожны найбольш буйны раённы цэнтр атрымае прамую тэлефонную сувязь са сталіцай БССР — Мінскам.

41,3 мільёна руб. на бягучых рахунках калгасаў БССР

У сувязі з рэалізацыяй багатага ўраджаю мінулага года ў Беларускай канторы Дзяржаўнага банка рэзка ўзрасла сума ўкладаў калгасаў БССР на бягучых рахунках. На 1 студзеня 1940 года калгасы маюць на сваіх бягучых рахунках 41,3 мільёна рублёў. У параўнанні з мінулым годам гэта сума ўзрасла на 14,5 мільёна рублёў.

Многія калгасы рэспублікі сталі пастаяннымі кліентамі ў Дзяржаўным банку. Так, калгас «Чырвоны агародніk», Мінскага раёна, мае на сваім бягучым рахунку 324.851 руб., калгас імені Молатава, гэтага-ж раёна, — 161.227 рублёў і т. д.

РУСКІ ДРАМТЭАТР У БРЭСЦЕ

У горадзе Брэсце ў красавіку адкрыецца Рускі драматычны тэатр. Зараз пачалася падрыхтоўка памяшкання—поўная рэканструкцыя былога тэатра «Свід». Тэатр разлічан на 800 месц. Брэсцкі гледач будзе мець магчымасць азнаёміцца з лепшымі п'есамі савецкага рэпертуара і п'есамі рускіх і іншакраінных класікаў.

Трупа брэсцкага Дзяржаўнага рускага тэатра намецілa ў сваім рэпертуары для пастаноўкі п'есы: «Любоў Яравая»—Трэнёва, «Платон Крэчэт» — Карнейчука, «Егор Булычоў» — М. Горкага, «У пушчах Палесся»—Я. Коласа і інш.

КІНО Ў ЛЕНІНСКІЯ ДН

У кінотэатрах БССР ля ленінскі арганізуюцца фотавыстаўкі на тэмы год без Леніна па ленінскаму шля кіраўніцтвам таварыша Сталіна», і Сталін—арганізатары беларускай жаўнасці» і інш. 21 і 22 студзеня тэатрах будуць дэманстравацца твары савецкай кінематаграфіі, у увасоблены вобразы геніяў чала Леніна і Сталіна.—«Ленін у 1918 «Ленін у Кастрычніку», «Вялікае і інш.

Лукомская гідраэлектраста

Экспертны совет Наркамзема БСС рыў праект пабудовы на рацэ Лу Чашніцкага раёна, буйнейшай у БС раэлектрастанцыі, магутнасцю ў 50 ват. Гідраэлектрастанцыя дасць э энергію 44-м калгасам, 2-м МТС—Л скай і Ветнянскай, двум млынам, і плодазаводу. Агульны кошт станц значан у 2 мільёны рублёў. Будаў пачнецца ў гэтым годзе.

За прайшоўшыя два гады на д рэках БССР пабудавана 14 новых ных гідраэлектрастанцый — у С скім, Мінскім, Прапойскім, Дрысенс іншых раёнах рэспублікі. Электрыфі да 40 калгасаў. Электрычнае свята малі дамы калгаснікаў, школы, больніцы, гаспадарчыя пабудовы ка

АДНАТОМНІК ТВОРАЎ В. В. МАЯКОЎСКАГА НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Дзяржаўнае выдавецтва пры Народных Камісараў БССР выдае да гадавіны з дня смерці вялікага пр скага паэта В. В. Маякоўскага а нік твораў паэта на беларускай мо адпаведнік будуць уключаны «Владимир Ильич Ленин», «Хорошо» шы «Левый марш», «Разговор с т шем Лениным», «Прозаседавш «Возьмем винтовки новые», «Песн ния» і інш.

Адпаведнік выйдзе тыражом у экземпляраў.

ПАРУШАЛЬНІКАЎ ПРЫНЦЫП СОВЕЦКАГА ГАНДЛЮ—ПАД С

13 студзеня Наркамат гандлю атрымаў скаргу ад групы пакупні тым, што ў магазіне № 18 Мінго гандля па вуліцы Варашылава ра магазіна браніруюць цукар для сам жання і продажу па знаёмству.

Пры праверцы гэтай скаргі на Дзяржаўная гандлёвая інспекцыя в ў падсобным памяшканні магазіна ваныя ад пакупнікоў 30 кілаграмаў 35 кавалкаў гаспадарчага мыла, 1 грамаў селяцоў і 2 з палавінай літ ліннага масла.

Дзяржаўная гандлёвая інспекцыя панавала дырэкцыі Мінгорхарчгандл алкладна знаць з работы в. а. заг. зіна Д. М. Батвінніка, прадаўшчыцу Фішкіну і накласці строгае адмі тыўнае спагнанне на прадаўшчыц Гурэвіч і Э. Г. Кульбак.

Матэрыял перадан пракурору гор ска для прыцягнення вінаватых да казнасці.

Мінгорхарчгандлю прапанавана ніць штодзённы кантроль за работай розначнай сеткі.

Дзеннік

Маркісцка-ленінскі універсітэт нога дня паведамляе ўсіх слухачоў, даўшых заявы на вячэрняе адзя што яны павінны з'явіцца на заня студзеня, у 7 гадзін вечара, у малу лу Дома партактыва (вул. Энгельса

Падаўшыя заявы на дзённае адзя павінны з'явіцца 18-га студзеня к зінам раніцы (вялікая зала Дома актыва—рог вуліц Энгельса і Карла са, 28/39).

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУН

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР
17 студзеня
БЕЗ ВІНЫ ВІНАВАТЫЯ
Абанемент № 91.
Пачатак у 7 г. 30 м.
Каса — з 2—8 г. веч.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
17 студзеня
ПАВЕЛ ГРЭКАЎ
Абанемент № 67.
Пачатак у 8 г. веч.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ФІЛАРМОНІЯ БССР (памяшканне клуба ім. Сталіна)
17 студзеня Абанемент № 14
18 студзеня Абанемент № 15
КАНЦЭРТЫ
Артыст Маскоўскага ордэна Леніна Акадэмічнага Малога тэатра, ордэнаносец
Ігар ІЛЫНСКІ
Лаўрэат Усесаюзнага конкурса скрыпачоў
Галіна БАРЫНАВА
Пачатак у 9 гадзін вечара.

Кінотэатр «Чырвоная зорка»
НА ГРАНІЦЫ
Кінотэатр «РОДИНА»
ПАТРЫЁТ
Кінотэатр «Інтэрнацыянал»
АПОШНІ ТАБАР
Кінотэатр «СПАРТАК»
ПАРУЧЫК КІЖЭ
Дзіцячы кінотэатр
ПАМЫЛКА ІНЖЫНЕРА КОЧЫНА
Кінотэатр «НАВІНЫ ДНЯ»
У ТАЕЖНЫХ ДАЛЯХ
(Кінонарыс у 5 частках)

СССР — НАРКАМХАРЧПРОМ — БССР
КАНДЗІЦЕРСКІЯ ФАБРЫКІ ТРЭСТА „БЕЛКАНДЗІЦЕР“:
«КОМУНАРКА» — Мінск,
«СПАРТАК» — Гомель,
«ЧЫРВОНЫ ХАРЧАВІК» — Бабруйск,
«Х КАСТРЫЧНІК» — Магілеў,
«ЧЫРВОНЫ МАЗЫРАНІН» — Нароўля,
БІСКВІТНАЯ фабрыка — Мінск
ВЫПУСКАЮЦЬ
КАРАМЕЛЬ, ЦУКЕРКІ, ДРАЖЭ, МАРМЕЛАД, ПАСЦІЛУ, ВАРЭННЕ І БІСКВІТ
з лепшай натуральнай сыравіны.
Продаж гэтых вырабаў праводзіцца
аптовымі гандлёвымі базамі аддзела збыта трэста «БЕЛКАНДЗІЦЕР» у гарадах: Мінску, Гомелі, Бабруйску, Віцебску, Магілеве, Оршы, Слуцку, Калінкавічах, Беластоку, Лідзе і Пінску;
фірменнымі рознічнымі магазінамі ў гарадах: Мінску, Гомелі, Бабруйску і Беластоку.

ДРУКАРНІ імені СТАЛІНА
(Дом друку, вул. Пушкіна, 55)
патрабуюцца:
высокакваліфікаваныя НАБОРШЧЫКІ І ДРУКАРЫ, РАБОТНІКІ ПАЖАРНА-ВАРТАВОЙ АХОВЫ, ПЕРАПЛЁТЧЫКІ, БРАШУРОЎШЧЫКІ І ПАДСОБНЫЯ РАБОЧЫЯ.
Звяртацца ў аддзел кадраў, 3-ці паверх, пакой № 63.

КАРТАГРАФІЧНАЙ ФАБРЫЦЫ № 3
(Энгельса, 2, Дом саюзаў)
патрабуюцца:
ІНЖЫНЕРЫ-КАРТОГРАФЫ, ТЭХНІКІ-КАРТОГРАФЫ, АГЕНТ ПА СНАБЖЭННЮ, ПРЫЁМШЧЫЦЫ, ПАДСОБНЫЯ РАБОЧЫЯ, работнікі пажарна-вартавой аховы і вучні для навучання рэтушорамі.
Звяртацца ў аддзел кадраў.

ГАЛОЎАПТЭКАЎПРАЎЛЕННЮ
(вул. Горкага, 1)
патрабуюцца:
НАМЕСНІКІ ГАЛОЎБУХА, СТ. РЭВІЗОР-БУХГАЛТАР, БУХГАЛТАР-РЭВІЗОР, БУХГАЛТАР-КАЛЬКУЛЯТАР, ведаючы аптэчную наменклатуру, ІНСПЕКТАР ПА СНАБЖЭННЮ, ведаючы аптэчную справу, БУХГАЛТАР, СТ. БУХГАЛТАР І МАШЫНІСТКА.

БЕЛКАНТОРЫ «ГЛАВНЕФТЕСБЫТА»
(Совецкая, 78)
патрабуюцца:
ЭКАНАМІСТЫ па працы і ПЛАНАВІКІ.

БЕЛКАНТОРЫ «ГАЛОЎТАБАК»
(пл. Свабоды, 4)
патрабуюцца:
БУХГАЛТАР-РЭВІЗОР І МАШЫНІСТКА.

ГАЛОЎМАСЛАПРОМУ
(Старамясніцкая, 6)
патрабуюцца;
ІНЖЫНЕРЫ-ТЭХНОЛАГІ па алочнай справе,
БУХГАЛТАРЫ І МАШЫНІ
Таксама РАЙТЭХНОЛАГІ І БУХГАЛТАРЫ для работы перыферыі.
Звяртацца ў аддзел кадраў.

БЕЛГАПДАЛЬПЛОДАГАРОДТРЭ
(Рэвалюцыйная, 2, тэл. № 23-7
патрабуюцца:
ЭКАНАМІСТЫ-ПЛАНАВІКІ, ФІНАНСІСТЫ, АГРАНОМЫ, ІНЖЫНЕР па вытворчасці та АЎТАТЭХНІК І САКРАТАР-МАШЫНІСТКА.

МІНСКАЙ ПАШТОВАЙ КАНТОР
(Ленінская, 34, 2 корпус, 3 па
патрабуюцца:
нарміроўшчыкі, юрысконсу эканаміст па працы і эксплуа цыі, пашталъёны, дастаўш тэлеграм, сартыроўшчыкі ка пандэнцыі, падсобныя рабо і грузчыкі.
Пашталъёны забяспечваюцца тарнатам.
Звяртацца ў аддзел кадраў.

ВЫДАВЕЦТВУ «ЗВЯЗДА»
патрабуюцца:
ШОФЕРЫ, ПРЫБІРАЛЬШЧЫ І ВАРТАЎНІКІ.
Звяртацца: Совецкая, 49, 2 па пакой № 1.

Тэрмінова патрабуецца па
Аплата па згодзе. Званіць тэл. № 21-361.

Калектыў работнікаў Нарком выражае глыбокае спачуванне ботніку наркамата тав. ЦЕМЛЯК повару пасцігшага яго гора — с ці МАЦЕРЫ.

Уп. Галоўлітбела № Г—1318.
Мінск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49.
М., Л., Ш.